незалежная газета
№ 22 (667) 16 чэрвеня 2010
www.nn.by
# Наша Ніва
П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А
Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Дзе Навумаў? Дзе Шэйман?

Старонка 8






## Дзе адпачыць без візы

Старонка 15



У НУМАРЫ

**Дэбют Шапіры коштам у мільярд рублёў**
У Гродне адгрымеў Фестываль нацыянальных культур. **Старонка 9.**

**«Садзіць чыноўнікаў, а не дрэвы»**
Разагнаны мітынг жыхароў Барысава, якія пратэставалі супраць пабудовы АЗС. **Старонка 7.**

**Найстаражытнейшы дакумент Кіеўскай Русі знайшлі ў сінагозе**
Гісторыя Беларусі. Хазары. Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 12.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.






# Не пакармілі

Вынікам паездкі Лукашэнкі ў Маскву стаў абразлівы ўльтыматум Мядзведзева. **Старонка 3.**

Лукашэнка: Вячэралі? Я прыехаў, думаў, хоць дасцё кавалак хлеба паесці...




## Вувузеюць усе

Гэты чэмпіянат свету запомніцца няспынным гудам. **Старонка 6.**



«...Каб аж было жудка, От то мая дудка!..»

# Алег Воўчак: Цяпер і Байкова зразумела, што яна не была самастойнай

**Затрыманая пракурор Святлана Байкова звярнулася з лістом да Аляксандра Лукашэнкі.**

Ліст напісаны ў вернападданніцкім стылі. У такім самым нядаўна звяртаўся да «гаранта Канстытуцыі» былы пракурор Мінскай вобласці Міхаіл Снягір. Яму гэта не дапамагло — Вярхоўны суд асудзіў Снегіра на 7 гадоў турмы.

«Я ўсе 16 гадоў была і застаюся з прэзідэнтам на яго бескампрамісных пазіцыях, — адзначае Байкова. — Маёй просьбай, паважаны Аляксандр Рыгоравіч, будзе ўзнаўленне маіх парушаных правоў і свабод, вызваленне мяне з СІЗА КДБ і дазвол працягнуць працу па выгнанні з працоўнага беларускага вулея трутня, дапамагаючы справамі і памкненнямі свайму прэзідэнту».

Былы следчы мінскай пракуратуры, праваабаронца Алег Воўчак даўно ведае Святлану Байкову.

**«Наша Ніва»: Калі Вы пазнаёміліся з Байковай?**

**Алег Воўчак:** Як толькі пачаў працаваць следчым. Нас, маладых супрацоўнікаў, адпраўлялі па каментары да Байковай. Нічога кепскага пра гэтую жанчыну сказаць не магу. Такіх прафесіяналаў жанчын у нашай краіне не так многа, бо праца спецыфічная і няўдзячная.

**«НН»: Яна першай расследавала справу зніклага Юрыя Захаранкі. Кантактавалі з ёй па гэтай справе?**

**АВ:** Так, яна мяне дапытвала. Калі мы з палкоўнікам Уладзімірам Барадачом знайшлі сваіх сведак. Ну, прадставілі запісы тэлефонных ананімных званкоў, якія тычыліся знікнення Захаранкі.

**«НН»: І якое ўражанне яна тады на Вас зрабіла?**

**АВ:** Справа была палітычная, таму яна не была ў сіле нічога змяніць. Не мог гэтага зрабіць нават намеснік генеральнага пракурора Мікалай Купрыянаў (быў абвінавачаны Лукашэнкам у карупцыйных злачынствах разам з Міхаілам Снегіром, але за краты не трапіў — «НН»). Калі б яны былі ў стане нешта зрабіць, то, магчыма, жывымі б яшчэ былі Віктар Ганчар і Анатоль Красоўскі. Думаю, цяпер яна



зразумела, што падчас працы ў пракуратуры не была самастойнай і бесстаронняй. Я зразумеў гэта пасля пяці гадоў працы следчым.

**«НН»: Чыталі ліст Байковай да Лукашэнкі?**

**АВ:** Ён наіўны. Паўсюль вера ў добрага цара. Але мяне парадавала тое, што яна не зламалася. І неяк пасвойму працягвае барацьбу. Прынамсі, я не памятаю выпадкаў, каб нехта з дзяржаўных чыноўнікаў абвяшчаў галадоўку. Калі яна ўзялася расследаваць справу мытнікаў, то для гэтага трэба было мець добрае лобі. Яна нажыла многа ворагаў. Хаця я не разумею, чаму дзяўбуць толькі яе, бо гэтай справай займаліся сотні аператыўнікаў. На мытні было, дзе ні капні — сутыкнешся са злачыннасцю, усё павязана.

**«НН»: Ці магчыма давесці справу да суда, бо пракуроры відавочна не зацікаўленыя ў гэтым?**

**АВ:** Зрабіць гэта будзе не так проста. Пракуратура будзе рабіць усё, каб справа рассыпалася да суда. Следства ў КДБ горшае, чым пракурорскае, усё ж яны не навучаліся на юрфаку. Найлепш «чэкістам» і пракурорскім знайсці кампраміс. Справа Байковай — гэта тупік. І яго трэба вырашаць, каб супрацьстаянне сілавікоў не выбухнула з новай сілай.

**«НН»: Лукашэнка можа ўмяшацца ў гэтую справу?**

**АВ:** Так, ён можа выступіць такім міратворцам, каб залагодзіць бакі. У адваротным выпадку можна падумаць, што кіраўнік дзяржавы ўжо не кантралюе сілавікоў.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Узаемаабмен прадуктамі і таварамі

**Былы кіраўнік Кастрычніцкага раёна Мінска выступіў у судзе з апошнім словам.**

Міхаіла Цыгана вінавацяць у хабарніцтве ў вялікіх памерах, перавышэнні службовых паўнамоцтваў і незаконных дзеяннях з боепрыпасамі.

Дзяржабвінаваўца папрасіў прызнаць віну Цыгана ў поўным аб'ёме і прызначыць пакаранне ў выглядзе дзевяці гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць кіраўнічыя пасады на пяць гадоў. А канфіскоўваць ёсць што: Mitsubishi Outlander, тры гаражы, дзве сталічныя кватэры, 427 бутэлек спіртнога, «брыльянт ва ўпакоўцы», «мерны злітак», вырабы з каштоўнага металу, больш за $83 тыс. і г.д. Абвінавачанне лічыць, што гэта ўсё атрымана злачынным шляхам.

У сваю чаргу адвакат Замяталіна патлумачыла пазіцыю абароны: былы чыноўнік зусім не вінаваты, а ўсё названае хабарамі насамрэч звычайныя падарункі ад старых сяброў, якія давалі рэчы і рабілі свае паслугі без усялякага падтэксту.

Пасля прамоваў абвінавачання і абароны былы чыноўнік узяў апошняе слова і расказаў трошкі свайго бачання справы. Гэтага аказалася дастаткова, каб суд пастанавіў узнавіць следства.

Цыган заявіў, што вобшук у яго кватэры праводзіўся з парушэннем крымінальна-працэсуальнага кодэкса. Падчас вобшуку ў гаражы прапалі 40 тыс. еўра і 69 тыс. даляраў — грошы яго сяброў з Расеі. Таксама кудысьці зніклі некаторыя важныя для Цыгана каштоўныя рэчы. Калі ён вырашыў пабудаваць у сталіцы кватэру, то звярнуўся да свайго старога сябра. І кватэру афармілі на дачку дырэктара рынка, што не мела ніякага дачынення да ягоных з сябром службовых адносінаў.

Увогуле, амаль усе людзі, хто нібы даваў хабары, 10—15-гадовай даўніны сябры. Адбываўся, са словаў Цыгана, узаемаабмен прадуктамі, таварамі, у тым ліку падгузнікамі, мясам ды бензінам. Усё было аплочана ці падаравана.

Цыган бажыцца, што ні разу не прасіў у гэтых людзей грошы за вырашэнне іх праблемаў. Вінаватым сябе не лічыць.

**Настасся Шамрэй**



## Пагоня на Грунвальд стартуе з Гродна — 16 ліпеня

Збіраем гарадзенскую харугву на святкаванне 600-х угодкаў бітвы пад Грунвальдам 16—18 ліпеня.

Выезд **раніцай 16.07** (пятніца) з Гродна.

**Вечар 16.07.** — прыезд на Грунвальдскае поле, размяшчэнне ў намётавым мястэчку.

**17.07** (субота) — урачыстасці. Ад 14.00 — рэканструкцыя Грунвальдскай бітвы, фэст фолк-музыкі.

**18.07** (нядзеля) — ад'езд у Гродна.

Мы замовілі аўтобус на 49 месцаў. Кошт паездкі — прыблізна 35 даляраў з чалавека. Увага! Кожны ўдзельнік «гарадзенска-грунвальдскага» падарожжа атрымае ў падарунак кашульку, адмыслова зробленую да святкавання 600 гадоў Грунвальда.

З дадатковых выдаткаў — месца ў намётавым мястэчку, паводле арганізатараў, каштуе 10 польскіх злотых (9—10 тысяч рублёў).

З сабой варта мець спальнік і намёт (калі няма свайго намёта, будзем адпраўляць на падсяленне).

Увага! Візавай падтрымкі не аказваем.

Кантактаваць: zasvabodu.hrodna@gmail.com, + 375 (152) 74-44-28

## Самае чытанае на nn.by за 9—15 чэрвеня

- «Пуцін з Мядзведзевым могуць нас не зразумець»
- Вячорку, Крэчку і Койпіша выключаюць з Партыі БНФ
- Вінцук выгнаў Паўла. Лявон выгнаў Алеся. Лёша выгнаў Франака
- Прэзідэнцкія выбары ў Беларусі пройдуць 26 верасня?
- Зімоўскі: «Маладыя ваўкі» тыпу сініцына і ганчара … смакталі ў яго ў прыёмнай»
- Завербаваны актывіст: з маёй дапамогай КДБ хацела дыскрэдытаваць Фінькевіча
- 7 жаночых памылак пасля сэксу
- Вайна з міліцыяй
- Сяброўкі футбалістаў (фоты)
- Анжаліка Борыс сыходзіць з пасады старшыні СПБ

### nn@nn.by

МАКЕЙ ДА МАККЕЙНА

А сапраўды, каб Макей-на  
з'ездзіў да таго Маккейна?  
І сказаў на ўвесь абшар:  
— Ганьба нам за збіты шар!

І прабачце за Дразды! –  
я малым быў шчэ тады.

**Кнехт**

## Сцісла

• **Ярмошына: выбараў 26 верасня не будзе.** На сайт «НН» надышла інфармацыя, быццам 16 чэрвеня палата прадстаўнікоў разгледзіць праект пастановы аб прызначэнні выбараў на 26 верасня. Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына назвала гэта правакацыяй. «Мяне па меншай меры паставілі б у вядомасць і запрасілі б на пасяджэнне», — адзначыла Л.Ярмошына.

• **За перавышэнне хуткасці адкажа ўласнік аўто.** Свежыя змены ў Адміністратыўным кодэксе тычацца адказнасці кіроўцаў, якія перавысілі дазволеную хуткасць руху, а іх парушэнне было зафіксавана відэакамерай. Адказваць за парушэнне мае ўласнік машыны. Калі ж ён не кіраваў аўто ў момант фіксацыі парушэння, яму самому прыйдзецца даказваць невінаватасць.

• **У сталіцы з'явіцца «Прэзідэнт-гатэль».** Гатэль «Кастрычніцкі», што на вуліцы Энгельса, зачынены на рэканструкцыю. Замест ранейшага будынка з'явяцца тры новыя корпусы. Гатэль стане пяцізоркавым і зменіць сваю назву на «Прэзідэнт-гатэль». Рэканструяваць аб'ект будзе турэцкая кампанія.

• **У Мінску ДАІ страляла ў парушальніка.** Толькі такім спосабам удалося яго спыніць. Падчас уцёкаў кіроўца «Лянчы» пратараніў два аўтамабілі, а на адным са святлафораў выехаў на тратуар і збіў жанчыну. Інспектар зрабіў 8 стрэлаў і прабіў заднія колы. Кіраваў аўтамабілем раней асуджаны за рабаўніцтва 39-гадовы мужчына. Як паказаў аналіз крыві, ён быў п'яны (2,23 праміле). Каб пакатацца гэтым разам, аўтамабіль ён угнаў.

• **Амністуюць 12 430 асуджаных.** Савет рэспублікі ўхваліў законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем Перамогі». Пад вызваленне падпадаюць непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, асуджаныя, якія маюць непаўналетніх дзяцей, пенсіянеры, інваліды, хворыя на актыўную форму сухотаў і ВІЧ, ветэраны і ліквідатары, параненыя падчас вайсковай службы. Гэта 11-я па ліку амністыя, якая праводзіцца ў Беларусі.

• **Пад пятніцу пацяплее.** 17 чэрвеня ў краіне будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўночна-ўсходніх раёнах Віцебшчыны — кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра днём 16—23°С. У Мінску — 18—20°С. 18 чэрвеня дажджы чакаюцца па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці. Тэмпература паветра днём 20—26°С.

**СМ; ЯВ; «Народная воля»; БЕЛТА; «Мінск-навіны»; БелаПАН**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Яўгенію К., Уладзіміру К., С.П., Святлане Р., Вользе Ш., Т.М., Аляксандру С., Віталю К., Таццяне В., Юрыю Г., Ліліі Ж., М.К., М.А., М.Л., С.А., Юрыю А., У.Р., К.М., Генадзю Ц., Алегу А., В.Г., Т.П., Надзеі С., Алегу Т., Ю.Дз., В.Г., Людміле Л., Кірылу М., Мікіту З., Алесю Л., Т.П., А.К., У.Ц., Генадзю Ш., В.Г., Таццяне К., Аляксандру Л., Альберту С., С.Б., Г.Ч., М.С., Пятру Т., І.Ф., Інэсе Б., Ігару М., В.Л., Канстанціну М., Міхаілу Ж., Юрыю Л., П.Р., Яўгену Ч., Ірыне М., Аляксандру К., Аляксандру В., Сяргею М. з Мінска.

# Не пакармілі

**Вынікам паездкі Лукашэнкі ў Маскву стаў абразлівы ўльтыматум Мядзведзева.**

Гарачае пытанне беларуска-расійскіх адносінаў — падпісанне Мытнага саюза. Ён нявыгадны Беларусі, бо абмяжоўвае эканамічную самастойнасць і створыць перашкоды ў інтэграцыі з ЕС. Аднак Лукашэнку спакушала магчымасць працягу энергетычнага гранта ад Масквы.

Беларусь настойвала: калі мы падпісваем Мытны саюз, пошлін на энергарэсурсы быць не можа. Расія ж прапануе бязмытную нафту толькі на ўнутрыбеларускія патрэбы. Астатнюю — па рынкавых цэнах.

28 мая прэм'ер-міністры Расіі і Казахстана дамовіліся аб увядзенні Мытнага кодэкса на двухбаковай аснове, бо Сяргей Сідорскі на сустрэчу не прыбыў.

Тым не менш, расійскаму віцэ-прэм'еру Ігару Шувалаву Лукашэнка казаў, што «Беларусь можа пайсці на кампрамісныя рашэнні ў Мытным саюзе пры ўмове раўнапраўных і паважлівых адносін». Пра магчымасць падпісання гаварыў і міністр эканомікі Мікалай Снапкоў.

Сустрэчы Лукашэнкі ў Маскве 11 чэрвеня магло не адбыцца ўвогуле. У той дзень прэзідэнт Мядзведзеў знаходзіўся ў Ташкенце на саміце Шанхайскай арганізацыі, а прэм'ер Пуцін вёў у Парыжы перамовы з Сарказі. Сустрэчу з Лукашэнкам расійскія лідэры прызначылі на глыбокі вечар, які ўжо пераходзіў у ноч. Журналісты прысутнічалі толькі пры першасным абмене рэплікамі.

Як заўсёды ў Расіі, Лукашэнка быў кампліментарны і выпраменьваў добры настрой. З Пуціным жартаваў, што Мядзведзеў яго не пакарміў, таму вячэра з прэм'ера. Праўда, гэта не паказчык: часта па прыездзе на Радзіму тон мяняецца на 180 градусаў.

Прэс-служба Мядзведзева паведаміла, што расійскі бок прапанаваў Беларусі ратыфікаваць пагадненне аб Мытным саюзе, а пытанне аб нафце вырашаць у двухбаковым парадку.

Выглядае, што Лукашэнка не пагадзіўся. У панядзелак у палаце прадстаўнікоў адклалі ратыфікацыю Мытнага кодэкса на няпэўны тэрмін. Пра адсутнасць вынікаў гаварыла і тое, што беларускі кіраўнік ніяк не пракаментаваў свой візіт.

Пасол Расіі Аляксандр Сурыкаў на прэс-канферэнцыі ў пятніцу пагрозліва намякнуў, што Расія гатовая ўвесці мытны кантроль на мяжы з Беларуссю. «Мытная мяжа будзе фармавацца па тэрыторыі Расіі і Казахстана з усімі наступствамі, якія з гэтага вынікаюць», — дадаў ён.

Нарэшце, у аўторак загаварыў Мядзведзеў. Ён сустрэўся з кіраўніком «Газпрома» Аляксеем Мілерам і паставіў Лукашэнку ўльтыматум. У пяцідзённы тэрмін Беларусь мусіць сплаціць каля 200 млн даляраў запазычанасці за газ, пастаўлены ў 2010 годзе.

«Калі гэтага зроблена не будзе, тады давядзецца ўжыць строгія меры», – сказаў Мядзведзеў.

Мядзведзеў адзначыў, што Лукашэнка тлумачыць недаплаты «цяжкім фінансавым становішчам». «Але, калі шчыра, цяпер усім цяжка», – адрэзаў Мядзведзеў.

Як лічыць Мілер, у Беларусі ёсць сродкі для аплаты доўгу, атрыманыя ад продажу 50% «Белтрансгаза».

На думку большасці аналітыкаў, Расія газавым шантажом хоча загнаць Беларусь у Мытны саюз.

Ніколі раней такі канфлікт не адбываўся перад прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі. Цікава, што апошнім часам мусіруюцца чуткі пра тое, што яны могуць адбыцца ўжо ўвосень, каб не даць Маскве часу разыграць выбарчую карту.

«Добра, што ў нас ёсць чым ваяваць», адзначыў Лукашэнка за некалькі гадзін да заявы Мядзведзева, калі наведваў спецназ КДБ «Альфа».

**Зміцер Панкавец**

**Размова паміж Лукашэнкам і Пуціным перад пачаткам перамоваў**

**Пуцін:** Аляксандр Рыгоравіч, пакуль вы вячэралі з Дзмітрыем Анатольевічам, я паспеў...

**Лукашэнка:** Ды нічога не накармілі...

**Пуцін:** ...спортам пазаймацца.

**Лукашэнка:** Вячэралі? Я прыехаў, думаў, хоць дасцё кавалак хлеба паесці...

**Сяргей Мусіенка, аналітык, блізкі да лукашэнкаўскай адміністрацыі:** Справакаваць заяву расійскага боку магло нежаданне ратыфікаваць мытныя пагадненні. Але праўдзівая мэта падобных заяваў — «жаданне рэваншу імперыі», цытуе яго Gazeta.ru. «Мы ўжо стаміліся ад гэтага. Ну няхай адключаць», — заявіў ён.

# Расказалі праўду ў Канадзе

Мінулы тыдзень дэлегацыя апазіцыі знаходзілася з візітам у Канадзе і ЗША.



**Някляеў і АГП цесна супрацоўнічаюць.**

У краіне «кляновага ліста» беларускіх апазіцыянераў на такім высокім узроўні прымалі ці не ўпершыню. У дэлегацыю ўваходзілі лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў, а таксама тры прадстаўнікі АГП — Анатоль Лябедзька, Яраслаў Раманчук і Андрэй Дзмітрыеў.

У Атаве палітыкі правялі сустрэчы ў парламенце, урадзе, з бізнесоўцамі. Прыняў іх у сваім кабінеце і прэм'ер Канады Стывен Харпер.

«Напэўна, у папярэднія некалькі гадоў у кабінетах улады Атавы не гаварылі столькі і адразу пра Беларусь, колькі за гэтыя тры дні», — сказаў А.Лябедзька.

Мелі сустрэчы апазіцыянеры і са старшынёй Рады БНР Івонкай Сурвіллай.

Пасля чацвёрка вылецела ў Вашынгтон, дзе сустракаліся з сенатарам, а таксама прадстаўнікамі дзярждэпартамента ЗША. У прыватнасці, сенатар-рэспубліканец Джон Маккейн паабяцаў прыляцець у Беларусь перад прэзідэнцкімі выбарамі. На апошніх амерыканскіх выбарах Маккейн быў супернікам Барака Абамы.

Варта таксама адзначыць, што падобныя візіты ў Штаты ўжо здзяйснялі сёлета іншыя кандыдаты ў прэзідэнты — Андрэй Саннікаў і Аляксандр Мілінкевіч.

**ЗП**

# Бакіеў: У Кыргызстан трэба ўводзіць войскі АДКБ

Крывавы кашмар у Кыргызстане.

У Джалал-Абадзе і Ошы распачаліся міжэтнічныя кіргізска-ўзбекскія сутыкненні. Кіргізы пачалі граміць узбекаў на поўдні краіны.

У выніку больш за 170 чалавек былі забітыя, а каля тысячы шпіталізаваныя. Міліцыя не ў стане ўтаймаваць хуліганаў.

Часовы ўрад быў вымушаны звярнуцца да Расіі з просьбай аб дапамозе па ўрэгуляванні сітуацыі. Каля 75 тысяч узбекаў былі вымушаныя ўцячы з Кыргызстана.

У такой сітуацыі тэрміновую прэс-канферэнцыю ў Мінску склікаў звергнуты прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў.

«Гэта зноў вешаюць на мяне і маіх сваякоў, — кажа былы прэзідэнт. — Часовы ўрад абсалютна не кантралюе сітуацыі і не ведае, што рабіць».

Бакіеў заклікае ўводзіць у Кыргызстан войскі АДКБ, каб забяспечыць бяспеку грамадзян. «Дзяліць там няма чаго», — кажа экс-лідэр Кыргызстана, заклікаючы кіргізскі і ўзбекскі народы спыніць кровапраліцце.

«Мусіруюцца чуткі, што я хачу вярнуцца ў Кыргызстан. Такога і ў думках няма. Хачу звярнуцца да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай аказаць гуманітарную дапамогу. Не часоваму ўраду, а людзям, каб было людзям што есці», — кажа К.Бакіеў.

Ён паведаміў, што нікуды не выязджаў з Беларусі. «Я не быў ні ў якой Турцыі. Мне вельмі падабаецца, толькі дажджоў шмат», — кажа выгнанец.

У той жа самы дзень стала вядома, што ў Вялікабрытаніі быў арыштаваны сын Курманбека Бакіева Максім. Цяпер ён можа стаць разменнай манетай, каб спыніць хваляванні ў краіне.

Відавочцы ў Джалал-Абадзе бачылі, што раз'юшаным натоўпам там кіраваў пляменнік Бакіева. Ён раздаў юнакам зброю, і тыя займаліся падпаламі і распраўамі.

**ЗП**




# Франака з сябрамі выключылі з Партыі БНФ

Франак Вячорка, Крэчка, Койпіш, а таксама Малей больш не сябры Фронту.

Традыцыі трэба шанаваць. Кіраўніцтва БНФ гэта і робіць. Кожны новы старшыня арганізацыі выключае з яе шэрагаў нязручных для сябе аднапартыйцаў.

Вінцук Вячорка ў свой час выключыў Паўла Севярынца і Вячаслава Сіўчыка, Лявон Баршчэўскі — Алеся Міхалевіча, Аляксей Янукевіч — Франака Вячорку.

Перад Соймам Янукевіч сказаў для «НН»: «Насамрэч у Партыі ёсць шэраг асобаў, якія працуюць выключна на шкоду арганізацыі — інфармацыйную і матэрыяльную. Так працягвацца не можа. Таму будзе ставіцца пытанне аб іх выключэнні».

Франаку ў правіну паставілі знішчэнне партыйнага сайта: нібыта ён не аддаў ад яго паролі новаму кіраўніцтву. Таксама яго звінавацілі ў вынасе з сядзібы аргтэхнікі. Апошняй кропляй стала скандальнае інтэрв'ю, дзе хлопец галаслоўна абвінаваціў каманду Янукевіча ў супрацоўніцтве з КДБ.

Сойм зрабілі закрытым для журналістаў. Партыйцы час ад часу выходзілі з залы, кажучы, што дзея досыць сумная. Агулам абмеркаванне па Вячорку доўжылася дзесяці тры гадзіны. Прагаласавалі, што трэба выключаць.

Койпіша выключылі за бойкі.

Таксама сяброўства страціў юрыст-адстаўнік з Брэстчыны Уладзімір Малей, які напісаў ліст у Міністэрства юстыцыі з просьбай праверыць дзейнасць кіраўніцтва.

Мінулыя выключэнцы ў будучыні стваралі новыя арганізацыі і партыі. Не выключана, што нешта падобнае можа паўтарыцца і цяпер.

**ЗП**

# Пахавалі Міхаіла Паўлава

**6 чэрвеня на 58–м годзе жыцця памёр былы старшыня Мінскага гарвынканкама Міхаіл Паўлаў.**

У красавіку летась Міхаіл Паўлаў трапіў у 5-ю клінічную бальніцу Мінска, дзе яму зрабілі аперацыю па выдаленні пухліны галаўнога мозгу. Рэабілітацыю былы мэр праходзіў у Ізраілі.

У верасні ў сувязі з рэцыдывам пухліны Паўлаву была зробленая паўторная аперацыя. На дзяржаўную працу ён так і не вярнуўся, хоць Лукашэнка і казаў, што Паўлаў адчувае сябе някепска і будзе пераведзены на іншую працу.

За час кіравання Паўлава ў сталіцы было пачата мноства будоўляў, горад пашыраўся. Будаваліся не толькі новыя дамы, але і гіпермаркеты, офісныя цэнтры, паркінгі, хакейныя пляцоўкі. Разам з тым, часта не ўлічваліся гістарычныя збудаванні, якіх было нямала зруйнавана.

**ЗП**

# Анжаліка Борыс сыходзіць з пасады старшыні Саюза палякаў

Яе рашэнне стала шокам для сяброў.

Пра гэта яна абвясціла ў суботу 12 чэрвеня. Намеснік старшыні СПБ Андрэй Пачобут распавёў «НН», што гэта стала поўнай нечаканасцю для сяброў арганізацыі.

«Гэта было нечакана. Мы ўсе шакаваныя такім рашэннем. Актывісты збіраюцца прасіць Анжаліку Борыс застацца на пасадзе старшыні», — паведаміў А.Пачобут.

У сувязі з рашэннем Анжалікі Борыс, якая матывавала яго важнымі асабістымі прычынамі, у найбліжэйшую суботу — 19 чэрвеня — адбудзецца сход Рады арганізацыі. У тым выпадку, калі спадарыня Анжаліка не зменіць свайго рашэння, на сходзе плануецца вырашыць пытанне прызначэння выканаўцы старшыні СПБ.

**Алесь Пілецкі**

# Завербаваны актывіст: з маёй дапамогай КДБ хацела дыскрэдытаваць Фінькевіча

Актывіст руху «Маладая Беларусь» Андрэй Кузьмінскі папрасіў прытулку ва Украіне. Ён прызнаўся ў тым, што быў завербаваны КДБ і назваў імёны тых, каго спецслужбы таксама схілялі да супрацы. «Мне вылучылі наступныя патрабаванні: напісаць заяву ў пракуратуру пра тое, што кіраўнік руху «Маладая Беларусь» Артур Фінькевіч уцягвае мяне ў супрацьпраўную дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі; дыскрэдытаваць Артура Фінькевіча ў вачах яго палітычных партнёраў», — прызнаўся А.Кузьмінскі.

У прыватнасці, яго змушалі разам з купкай іншых маладзёнаў правесці псеўдаз'езд арганізацыі і выключыць Фінькевіча.

**Сяргей Гезгала**

# Літоўскія грошы ў Беларусі

**Бізнэсоўцы з суседняй краіны будуюць у Беларусі жылыя комплексы і гіпермаркеты, а таксама валодаюць прадуктовымі крамамі.**

Бізнэс суседніх краін перадусім асацыюецца з Расіяй. Доля Польшчы, Латвіі, Украіны ці Літвы глядзіцца проста драбнюткімі. Напрыклад, леташняя доля літоўскіх інвестыцый мізэрная ў параўнанні з расійскімі — летась з захаду прыйшло $33 мільёны, а з усходу — $6 мільярдаў.

Тым не менш, беларускія ўлады зацікаўленыя ў шматвектарным прытоку грошай. Сведчанне гэтаму — пастаянныя эканамічна-інвестыцыйныя форумы дзвюх дзяржаў. Яны праводзяцца па некалькі разоў на год.

На літоўскі рынак усё актыўней прыходзіць польскі капітал, выцясняючы мясцовых бізнэсоўцаў. Куды ісці? Вядома ж, у суседнюю Беларусь. «НН» робіць агляд самых амбіцыйных літоўскіх праектаў у нашай краіне.

## Гатэль для «Партызана»

Сімвалам беларуска-літоўскіх адносінаў можна лічыць бізнэсоўца Уладзіміра Раманава. Яшчэ ў 2007 годзе ён увайшоў у давер да кіраўніцтва Беларусі, запланаваўшы рэалізацыю грандыёзных спартыўных праектаў ў Мінску. Галоўны аб'ект — футбольная арэна на 45 тысяч месцаў, якая будзе ўзводзіцца ў звязцы з забаўляльным комплексам, гатэлямі, офіснымі будынкамі на стадыёне «Трактар». Кошт будоўлі складзе каля 250 мільёнаў еўра.

Апроч таго, літоўцы меліся збудаваць два жылыя комплексы ў мінскіх спальных раёнах Лошыца і Каменная Горка коштам па 50 мільёнаў еўра кожны.

Працы ў Мінску каардынуе СЗАТ «Стадыум», заснавальнікамі якога з'яўляюцца літоўская UBIG і Адміністрацыя Заводскага раёна Мінска.

Згодна з інвестыцыйнай дамовай, працы павінны былі закончыцца да 2010 года, але Мінгарвыканкам запасся цярпеннем і гатовы чакаць яшчэ як мінімум год.

Таксама Раманаў валодае мінскім футбольным клубам «Партызан» (раней — МТЗ-РІПО). Каманда пляцецца на апошнім месцы ў чэмпіянаце Беларусі.

Выходзец з Расіі, Уладзімір Раманаў разбагацеў у пачатку 1990-х на стварэнні першага ў Літве камерцыйнага банка Ukio bankо. Другая крыніца прыбытку — інвестыцыйная кампанія UBIG, якая, апроч нашай краіны, мае інтарэсы ў Прыбалтыцы і на Балканах. Крызіс моцна ўдарыў па бізнэсмене — цяпер ён нават не ўваходзіць у Топ-40 самых багатых людзей Літвы.



**Крызіс падкасіў любімага бізнэсоўца беларускіх уладаў Уладзіміра Раманава.**

## Опа, «Ома»!

А вось браты Аўгустынас і Артурас Ракаўскасы ў элітным спісе прысутнічаюць. Яны ўзначальваюць літоўска-фінскую кампанію Senukai. З дапамогай будаўнічых крамаў, раскіданых па ўсёй Літве, браты кантралююць чвэрць рынку краіны. Другі профіль іх працы — грузаперавозкі. Іх маёмасць ацэньваецца ў 200 мільёнаў еўра.

У Беларусь яны інвестуюць грошы, будуючы крамы ОМА. Гандлёвыя цэнтры ўжо адкрытыя ў Мінску, Гомелі, Бабруйску і Баранавічах. У гэтым месяцы скончаецца будаўніцтва найбольшага ў краіне будаўнічага гіпермаркета. Крама, якая знаходзіцца на выездзе са сталіцы ў бок Брэста, мае адкрыцца да 3 ліпеня. Аб'ём прыцягнутых інвестыцый перавышае 10 мільёнаў еўра.

## Суседскія «Суседзі»

У спісе літоўскіх бізнэсменаў, якія маюць бізнэс у Беларусі, ёсць і жанчына. Дачка аднаго з былых міністраў сельскай гаспадаркі Літвы, уласніца кампаніі «Лібрэтык» Алма Яўнсямене адкрыла першы супермаркет «Суседзі» ў 1999 годзе. З таго часу колькасць крам з такой вывескай перавысіла 25 адзінак і выйшла за межы Мінска — у Бабруйск. Праўда, нядаўна Міністэрства гандлю ініцыявала антыманапольнае разбіральніцтва, калі высветлілася, што розныя крамы «Суседзі» належаць шасці ўласнікам. Нядаўна Алма набыла яшчэ дзесяць крам — муніцыпальную сетку супермаркетаў «Падзея».

У спісе актываў літоўкі ёсць і прадпрыемства «Навіта». Гэта сем піцэрый пад вывескай «Тэмпа» ў Мінску.

## Ліда — філіял Літвы

Сапраўдным цэнтрам па сувязях Беларусі з Літвой апошнім часам стала Ліда. Кіраўнік раёна Андрэй Худык мае шчыльныя сувязі з заходнімі бізнэсоўцамі. Па чутках, яны лабіравалі прызначэнне яго на пасаду старшыні Гродзенскага аблвыканкама ці, хаця б, гарвыканкама.

Пад ягоным кіраўніцтвам колькасць сумесных літоўска-беларускіх прадпрыемстваў павялічылася да 15 — швейная фабрыка «Белрыматэкс», прадпрыемства па вырабе драўлянай тары «Ліда-Балтыя», спартыўнае адзенне «Аўдымас». Дастаткова сказаць, што летась на Лідскі раён прыходзілася 13% ад экспарту ўсёй Беларусі ў Літву.

Хоць «Лідскае піва» належыць не літоўцам, а фінам, але сувязі прадпрыемства з заходнім суседам моцныя. Па-першае, прадпрыемства ўзначальвае літовец Аўдрус Мікшыс. Па-другое, некаторыя гатункі лідскага піва разліваюцца на заводзе ў Коўне.

## Сузор'е «Беларусфільма»

Тым часам уладальнік літоўскай кампаніі Hunner Арвідас Авуліс таксама гатовы прафінансаваць будаўнічы праект у Мінску.

Мінскія ўлады выдзяляюць элітную тэрыторыю для будаўніцтва жылых дамоў, пры ўмове што літоўцы рэканструююць «Беларусьфільм». Спачатку з'явяцца дзесяць адналькавых дваццаціпавярховых дамоў, адзін з якіх дастанецца кінастудыі, а пасля літоўцы дабудуюць яшчэ і бізнэс-цэнтры. Комлекс атрымае назву «Сузор'е».

**Яўген Васількоў**





**Перспектывы**

- Відмантас Кучынскас з кампаніі Arvi ir ko пры падтрымцы «Беларуськалія» гатовы пабудаваць у Беларусі завод па вытворчасці складаных угнаенняў.
- Прэзідэнт Канфедэрацыі прамыслоўцаў Літвы Браніславас Лубіс мяркуе, што аэрапорт у Гродне варта зрабіць міжнародным, каб аптымізаваць лагістыку на поўдні Літвы.
- Да 2011 года ў Ракаве, што на мяжы Мінскага і Валожынскага раёна, літоўцы пабудуюць транспартна–лагістычны цэнтр.
- У Магілёве літоўцамі ўзводзіцца культурна–аздараўленчы цэнтр коштам $7 мільёнаў.

**Інвестыцыі Літвы ў Беларусь, $ млн**

| | |
|---|---|
| **І кв. 2010** | 6 |
| **2009** | 33 |
| **2008** | 16 |
| **2007** | 36 |

**Крыніца: Белстат**

**Тавараабарот**

| | |
|---|---|
| **І кв. 2010** | $296 млн |
| **2009** | $1,078 млрд |
| **2008** | $856 млн |
| **2007** | $744 млн |

**Крыніца: Дэпартамент статыстыкі Літвы**

# Супрацоўнікі «Белнафтахіма»: Акцыя «Стоп-бензін» не паўплывала на нашу працу

Канцэрн зрабіў выгляд, што не заўважыў пратэсту.

Паводле слоў супрацоўнікаў АЗС канцэрна, плынь спажыўцоў паліва не змяншалася, і з даты пачатку акцыі — 1 чэрвеня — прыкметныхстратаў у колькасці кліентаў не адбылося. Яны таксама сцвярджаюць, што большасць работнікаў АЗС не ведаюць аб акцыі пратэсту аўтааматараў.

Каментуючы сітуацыю з байкатаваннем заправак «Белнафтахіма», прадстаўнік АЗС №49 Міхаіл Кудзін заявіў: «Я коратка чуў пра акцыю. Мне здаецца, гэта глупства — людзі не адмовяцца ад паліва, усім трэба дабірацца да працы, нехта едзе адпачываць. Так, нашы аўтазаправачныя станцыі ўваходзяць у канцэрн «Белнафтахім», але самастойна мы не фармуем цэнаў, дык пры чым тут АЗС?»

Зусім інакш да мерапрыемства ставяцца сталічныя аўтааматары. «Асабіста я браў удзел у акцыі, — паведаміў Аляксей Захватаў, аўтаэлектрык. — Расход паліва майго аўтамабіля складае каля 15 літраў на 100 кіламетраў. Нават невялікае павышэнне цаны ўдарыла б па кішэні, што ўжо казаць пра той цэнавы скачок, які мы назіраем. Я ўжо запраўляў аўтамабіль адным літрам бензіну ў падтрымку акцыі».

З 1 да 4 чэрвеня ў шэрагу гарадоў Беларусі праходзіла акцыя аўтааматараў супраць павышэння цэн на бензін на ўнутраным рынку. Яе ўдзельнікі заявілі пра намер ігнараваць запраўкі канцэрна «Белнафтахім» або ў знак пратэсту купляць не больш як два літры паліва.

**Захар Шчарбакоў, БелаПАН**

## Сцісла

• **Курс еўра застаецца нізкім.** Мінулы тыдзень ён вагаўся каля 1,2 даляра за еўра. Эксперты зважаюць, што макраэканамічныя паказчыкі еўрапейскай эканомікі добрыя. Таму многія лічаць аслабленне еўра спекулятыўным.

• **Дзеючыя стаўкі ўвазных мытаў на аўтамабілі для фізічных асоб могуць быць захаваны ў Беларусі да 2012 года.** Пра гэта заявіў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Сяргей Барысюк.

• **Сярэднегадавая цана расійскага газу для Беларусі ў 2010 годзе складзе 187 даляраў за тысячу кубаметраў.** Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік «Газпрома» Сяргей Купрыянаў. Летась Беларусь плаціла 150.

• **Мінаблвыканкам вяртае піва ў кіёскі на прыпынках.** Забарона на гандаль півам у кіёсках была ўведзена ў Мінскай вобласці ў канцы лета 2009 года. Цяпер з ранейшых абмежаванняў выключаная норма, якая датычыцца прыпынкаў.

• **Апельсінавы сок падаражае ўдвая праз неўраджай у Бразіліі.** На сусветным рынку вытворчасці апельсінавага соку на долю Бразіліі прыпадае прыкладна палова.

• **Золатавалютныя рэзервы Беларусі, падлічаныя паводле стандартаў МВФ, на 1 чэрвеня склалі 5792,4 мільёна даляраў.** За май гэты паказнік скараціўся на 4,2%, за красавік — на 0,7%. Яны зніжаюцца другі месяц запар пасля таго, як у сакавіку прыйшла апошняя частка крэдыту stand-by на 700 мільёнаў даляраў. Дзякуючы ёй, залаты запас вырас у сакавіку на 8,9%.

• **Крэдытная палёгка для маладых сямей.** У распрацаваным праекце ўказа маладым сем'ям, якія жывуць у гарадах з насельніцтвам да 50 тысяч чалавек, будзе выдавацца крэдыт на жыллё на 40 гадоў пад 3% (раней толькі ў населеных пунктах да 20 тысяч чалавек). У больших гарадах сем'ям з двума непаўналетнімі дзецьмі прапануюць крэдыт пад 3% (раней — 5%).

**ЯВ**

# «Не з’явіўся на экзамены»

24 мая інтэрнэт-газета «Салідарнасць» змясціла вялікую гутарку з драматургам і сцэнарыстам Андрэем Курэйчыкам. Гутарка збольшага датычыла творчасці, аднак некалькі фраз аб стаўленні да паэта Уладзіміра Някляева і грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» каштавалі драматургу працы выкладчыка ва Універсітэце культуры. А.Курэйчыку проста не працягнулі кантракт.



Сцэнарыст Курэйчык выкладаў у «Кульку» за 100 тыс. рублёў.

«Мяне па-людску шакавала затрыманне найбуйнейшага сучаснага беларускага паэта Уладзіміра Някляева і актывістаў кампаніі «Гавары праўду!». Мне гэта нагадала часы Варфаламееўскай ночы, чарнасоценных пагромаў, сталінскіх аблаваў, калі з апанентам было прасцей не спрачацца, а даць яму па галаве, а яшчэ лепш вырваць кішкі, укрыжаваць і спаліць на цэнтральнай плошчы. У наша грамадства вяртаецца сярэднявечная логіка, сярэднявечная мараль і іх неад'емныя атрыбуты — пагромы, аблавы, масавыя ператрусы і арышты, запалохванні і г.д.», — заявіў Андрэй Курэйчык у інтэрв’ю выданню.

Пасля публікацыі прэс-служба сцэнарыста распаўсюдзіла заяву, што А.Курэйчыка звольнілі па палітычных матывах. 30 чэрвеня ў драматурга скончаўся працоўны кантракт. На кафедры яму паведамілі, што на наступны год кантракт працягнуты не будзе, хоць прадметы, якія ён вёў, будуць вывучацца і надалей. Яго месца на курсе аддадуць іншаму выкладчыку, але якому — пакуль не вырашылі. Магчыма, крытыку Сабалеўскаму, якому нядаўна споўнілася 80 гадоў. На пытанне драматурга аб прычынах такога рашэння быў, паводле яго словаў, дадзены адказ: «Гэта ўказанне зверху. Вы нам вельмі падабаецеся, і студэнтам вельмі падабаецеся, але, на жаль, мы нічога не можам зрабіць».

Разам з тым, Наталля Шалупенка, дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, дзе працаваў А.Курэйчык, паведаміла «НН», што нічога пра звальненне сцэнарыста не ведае. «Адзінае, што я магу сказаць, гэта тое, што спадар Курэйчык не з’явіўся ў суботу на экзамены. Ні загада аб звальненні, ні заявы самога Андрэя Курэйчыка я не бачыла», — заўважыла Н.Шалупенка.

Сцэнарыст кажа, што працаваў ва Універсітэце культуры дзеля ідэі. Яго заробак там не перавышаў сотні тысяч рублёў.

**Алесь Пілецкі**

# Элтан Джон, Джо Кокер, Стынг і Limp Bizkit у Мінску

Цягам года ў Беларусь наведаюцца мега–зоркі сусветнай сцэны.

Не паспелі адгрымець канцэрты Prodigy, Rammstein, Scorpions і адскакаць цэлы дэсант дыска-каралёў 1990-х з Доктарам Албанам на чале, як услед за імі да нас едуць Ванеса Мэй, Элтан Джон, Стынг, Джо Кокер і Limp Bizkit. Прадстаўнікі мінскіх канцэртных агенцтваў не выключаюць прыезду ў Беларусь Мадонны і Metallica. Чуецца і нясмелы шэпт («спадабалася ім у нас!») пра другі візіт Rammstein.

## «Чароўная скрыпка» Ванесы Мэй

Сусветнавядомая скрыпачка Ванеса Мэй завітае ў Мінск 20 чэрвеня з шоу-праграмай «Чароўная скрыпка». Канцэрт адбудзецца ў сталічным Палацы спорту. Пачатак а 19-й. Квіткі каштуюць 75—350 тысяч рублёў. У Мінску скрыпачка паўдзельнічае ў дабрачыннай акцыі: па ініцыятыве партала TUT.BY яна выставіла на інтэрнэт-аўкцыён свой лот: квіток на 2 персоны на шоу «Чароўная скрыпка» + уласны аўтограф Ванесы Мэй на любой рэчы ўладальніка гэтага лота. Сродкі ад продажу пойдуць на лячэнне Лерачкі Шчэрбы.

## Сэр Элтан Джон з хітамі за 40 гадоў

Каштаваць «кракадайлз рок» будзе ад 140 да 460 тысяч рублёў. Навіна пра прыезд брытанца магла абярнуцца чарговым скандалам. Старшыня грамадскай рады па маральнасці Мікалай Чаргінец заявіў пра намер азнаёміцца з відэазапісамі папярэдніх выступаў спевака. Аднак, відавочна, што такога шуму, як вакол прыезду Rammstein, чакаць не варта. Бо сэр Элтан, адкрыты гей, на сцэне не скандаліць.

Канцэрт адбудзецца ў «Мінск-Арэне» 26 чэрвеня а 20-й. З поспехам мінскага канцэрта сэра Элтана канцэртныя агенты звязваюць надзеі на магчымы прыезд у Беларусь Мадонны.

## Стынг прывязе Symphonicities

Былы настаўнік англійскай мовы Гордан Мэцью Самнер з вострым сцэнічным імем наведаецца ў Мінск у верасні. Яго праграму Symphonicities, падрыхтаваную з брытанскім Каралеўскім філарманічным аркестрам, можна будзе пачуць 18 верасня ў «Мінск-Арэне» а 20-й.

| Хто | Дзе і калі | Колькі каштуе |
|---|---|---|
| Ванеса Мэй | 20 чэрвеня а 19–й Палац спорту | 75—350 тысяч беларускіх рублёў |
| Сэр Элтан Джон | 26 чэрвеня а 20–й «Мінск–Арэна» | 140—460 тысяч беларускіх рублёў |
| Стынг | 18 верасня а 20–й «Мінск–Арэна» | Ад 120 тысяч беларускіх рублёў |
| Джо Кокер | 1 кастрычніка «Мінск–Арэна» | Ад 100 тысяч беларускіх рублёў |
| Limp Bizkit | 5 кастрычніка «Мінск–арэна» | 100—200 тысяч беларускіх рублёў |



PHOTO.BYMEDIA.NET

Пасля таго, як у сталіцы збудавалі «Мінск-Арэну» на 15 тысяч гледачоў, у Беларусь пачалі завітваць суперзоркі.

Самыя танныя квіткі каштуюць ад 120 тысяч. Усяго іх 13 тысяч. Цана найбольш дарагіх квіткоў пакуль не разгалошваецца. Зрэшты, кажуць арганізатары, VIP-месцы могуць выкупіць замежнікі — канцэртам у Мінску зацікавіліся грамадзяне 10 краін, у тым ліку далёкай Канады. Праваабаронцаў мінскія гастролі Стынга могуць насцярожыць (ці толькі ў «Мінск-Арэне» ён будзе выступаць), бо яшчэ многія памятаюць ягоны выступ на прыватнай вечарыне прэзідэнта Узбекістана Іслама Карымава.

## Джо Кокер пагрукоча ў Мінску

Знакаміты блюзмен Джо Кокер зазірне ў Мінск па дарозе з Рыгі на Кіеў. Аўтар эратычнага гімна з фільма «Дзевяць з паловай тыдняў» раней ужо бываў у Мінску. Гэтым разам ён наведае Беларусь у рамках Hard knocks tour у падтрымку альбома Hard knocks. Як і Элтан Джон са Стынгам, выступіць ён у «Мінск-Арэне». Квіткі каштуюць ад 100 тыс. рублёў

## Праз год пасля Prodigy

5 кастрычніка ў «Мінск-арэне» зайграюць амерыканцы Limp Bizkit. Гурт нядаўна ўз’яднаўся і запісаў новы альбом Gold Cobra. Яго і пачуюць тыя шчаслівчыкі, што набудуць квіткі за 100—200 тысяч рублёў.

Не выключана, што з лідэрам LB Фрэдам Дэрстам праспявае рэпер Сярога, які ўжо мае досвед супрацы з амерыканцамі ў часе іх расійскага тура. Цікава, што ў часе свайго еўрапейскага тура гурт не наведае Латвіі, дзе нарадзіўся ўдзельнік Limp Bizkit Леорс Дзімантс, сын расійскага выканаўцы шансона і рамансаў Грыгорыя Дзіманта.

**Сямён Печанко**

## Здарэнні сцісла

• **Шкілет пад падлогай знайшлі ў вёсцы Собалеўка Клімавіцкага раёна.** Гаспадар дома памёр месяц назад, чый труп ляжаў у яго пад падлогай — невядома. Пачалося следства.

• **Унук замучыў дзеда.** Гэта адбылося ў вёсцы Трасцяніца Камянецкага раёна. Да 82-гадовага пенсіянера прыйшоў унук з двума прыяцелямі. Калі пенсіянер пачуў грукат у дзверы і выйшаў на ганак, яму на галаву накінулі куртку, каб не ўбачыў унука, і сталі збіваць. Ад траўмаў дзед сканаў. Злачынцы абшукалі дом, знайшлі 40 тысяч рублёў і дзве пляшкі гарэлкі, якую выпілі ў доме ахвяры. Пасля паклалі мёртвага пенсіянера на ложак, нібыта ён сам памёр. Усе трое атрымалі па 16—18 гадоў турмы.

• **Кінарэжысёр Туровіч асуджаны на шэсць гадоў.** Па справе, распачатай у дачыненні да кінарэжысёра, у якасці пацярпелых праходзілі шэсць хлопчыкаў. Устаноўлена, што распусныя дзеянні ў іх дачыненні абвінавачваны ўчыняў з лютага 2007 года па красавік 2009 года.

• **Барменка прапіла $3 тыс.** За няпоўны месяц працы ў більярдным клубе Шчучына 19-гадовая дзяўчына «пазычыла» алкагольных напояў на суму каля 9 мільёнаў рублёў. Дзяўчына брала іх з сабою, выязджаючы на прыроду з сябрамі.

• **Беларускія гастарбайтэры рабавалі варонежцаў.** Тром жыхарам Беларусі, што падаліся ў расійскі горад працаваць, заробкі на будоўлі падаліся замалымі. На вуліцах Варонежа яны нападалі на людзей, хто па адным ішоў, забіралі мабільнікі, гадзіннікі і партманэ. Ім пагражае да 10 гадоў турмы.

• **У Столінскім раёне патанула 11-гадовая дзяўчынка.** Трагедыя адбылася на рацэ Маства непадалёк ад вёскі Аздамічы. Дзяўчынка з сяброўкай купалася на мелкаводдзі. Спатыкнуўшыся і трапіўшы ў яму, яна стала тануць. Гэта ўбачылі рыбакі, якія былі прыкладна за 200 метраў, але падплыць не паспелі. Глыбіня ракі ў гэтым месцы дасягае чатырох метраў. У суботу—нядзелю ахвярамі вады ў Брэсцкай вобласці сталі яшчэ шэсць чалавек.

• **У адным ДТЗ загінулі пяць чалавек.** Раніцай 12 чэрвеня пад Лагойскам «Фальксваген», якім кіраваў пенсіянер 1949 года нар., выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з «БМВ», за рулём якога знаходзіўся мэнэджэр аднаго з прадпрыемстваў 1958 года нараджэння. Ад удару «БМВ» кінула пад колы аўтапоезда «Івека», як рухаўся насустрач. Загінулі кіроўца «БМВ», яго жонка, дачка, унучка і сын. Усяго за выходныя ў 65 ДТЗ 16 чалавек загінула. Моцная спёка пагоршыла сітуацыю: кіроўцам было цяжэй засяродзіцца.

• **Пераплыў Шчару, каб злавіць браканьераў.** Увечары 10 чэрвеня ў Ляхавіцкі РАУС патэлефанавалі дачнікі з вёскі Чвыры і паведамілі, што на рацэ Шчара трое мужчын сеткай ловяць рыбу. Заўважыўшы міліцыю, браканьеры пабеглі да ракі, пераплылі на іншы бераг і схаваліся ў хмызняку. Нядоўга думаючы, старшы оперупаўнаважаны Алег Урбановіч як быў у міліцэйскім убранні кінуўся ў ваду і паплыў за імі. Браканьеры здаліся.

• **Аддаў гранату сам.** «РГД-33-1» прынёс у аддзяленне міліцыі жыхар вёскі Рум Валожынскага раёна. Мужчына сказаў, што знайшоў гранату каля сваёй вёскі. Яна баявая, спраўная. «Партызанскі край. Там можна яшчэ і не такое знайсці...» — кажуць у міліцыі.

• **Заснуў на пляжы і страціў 2,8 млн рублёў.** З кішэні 30-гадовага жыхара Жыткавіч, які, выпіўшы, спаў на пляжы, выкралі банкаўскую картку. З яе потым былі знятыя грошы. Міліцыя ўстанавіла, што крадзеж учынілі 21-гадовы навучэнец мясцовага ПТВ і яго 19-гадовы таварыш.

• **Трактар «скасіў» жанчыну разам з травой.** Інцыдэнт адбыўся ля аўтадарогі Капыль—Грозава—Грэск. Кіроўца трактара касіў узбочыну і наехаў прычапной касілкай на жанчыну, што ляжала ў траве. Пацярпелая трапіла ў бальніцу з чэрапна-мазгавой і іншымі траўмамі. Устаноўлена, што яна была нецвярозая.

• **Глыбачаніна будуць судзіць за здзек з птушкі.** Жыхар Глыбокага злавіў жывую птушку і прывязаў яе да шаста на гародзе як пудзіла. Гэта заўважылі суседзі і патэлефанавалі ў інспекцыю па ахове жывёльнага і раслiннага свету. Супрацоўнікі інспекцыі вызвалілі птушку і склалі пратакол. Адміністрацыйная адказнасць за жорсткае абыходжанне з жывёламі прадугледжвае штраф да 700 тыс. рублёў або арышт да 15 сутак.

**СМ; БелаПАН, «Еўрарадыё», «Рэгіянальная газета»**

# Вувузеюць усе

**Гэты чэмпіянат свету запомніцца няспынным гудам.**

«От, бывала, раней сядзіш на ганку на дачы ўлетку, адпачываеш, пчолкі-мушкі звіняць, птушкі спяваюць, цішыня і спакой... І тут праз тры лініі нехта пачынае ці то цыркуляркай, ці то электрагэблем гудзець. І ные, і ные, і ные, па вушах ездзіць. А потым праз паўгадзіны сціхае — і зноў цішыня і спакой. Вось ён рай. А тут паўтары гадзіны выюць і выюць трыбуны гэтымі спецыяльнымі дудкамі і не сціхаюць ніфіга. Як там футбалістам? Я б кінулася, напэўна», — піша ў сваім Жывым дзённіку блогерка irisation.

І сапраўды, гэты гуд не сціхае ні на хвіліну. Нават падчас тэлевізійных трансляцый ён паспявае добра надакучваць.

Вувузела — доўгая дудка, каля метра, якая выкарыстоўваецца футбольнымі балельшчыкамі ў Паўднёвай Афрыцы. Першапачаткова вувузела рабілася з вола. Прыхільнікі гэтага інструмента кажуць, што вувузелы маюць даўнюю гісторыю.

Маўляў, у некаторых плямёнах Афрыкі ў сурмы, зробленыя з рагоў антылопы, сурмілі, каб сабраць сход. У пачатку нашага стагоддзя кампанія Masincedane Sport пачала масавы выпуск такіх дудак, але ўжо з пластыку.

У чэмпіянаце ПАР фанаты розных каманд выкарыстоўваюць вувузелы розных колераў. На мундыялі ўсе дудкі гучаць на адной вышыні — ад гэтага гук становіцца такім пранізлівым і надакучлівым.




**Нашы продкі дудзелі ў дудкі, вельмі падобныя да вувузелаў. На гравюры: беларускія вайсковыя музыкі XVI ст.**

Многія футбалісты, заўзятары, каментатары выступаюць за забарону вувузелаў на матчах чэмпіянату свету. Тым не менш, прэзідэнт ФІФА Зеп Блатэр адразу абверг такія прапановы: «Мы не павінны спрабаваць еўрапеізаваць афрыканскі чэмпіянат свету».

Насамрэч, дудкі на стадыёнах не такая рэдкая ў сусветным футболе з'ява. Але паўсюль у Еўропе з імі спрабуюць змагацца. Выкарыстанне такіх інструментаў лічыцца прыкладам нізкай культуры ў фанатаў.

Беларусь тут не выключэнне. Напрыклад, фанаты зборнай Беларусі з групоўкі «Б-12» забараняюць уваход на сваю трыбуну з дудкамі. Нават банер адмысловы намалявалі.

Як бы тое ні было, але без гуку вувузелаў сёлетняе футбольнае свята ўжо не ўявіць.

**ЗП**

# Сокер, ці Футбол па-амерыканску

**Адной з найбольшых сенсацый пачатку чэмпіянату свету па футболе сталася нічыя амерыканцаў з англічанамі.**

Родапачынальнікі футбола ўжо на чацвёртай хвіліне намаганнямі Джэрарда лік адкрылі.

Амерыканцы адыграліся напрыканцы першага тайма. Клінт Дэмпсі нанёс удар на ўдачу, ён быў не такім моцным і складаным, але ў брамніка еўрапейцаў Грына мяч выскачыў з рук і закаціўся ў вароты. Не трэба лічыць, што амерыканцам проста пашанцавала. Пры канцы матча яны былі бліжэйшыя да перамогі, чым супернікі.

Дык ці выпадковы такі вынік? Калі паглядзець у мінулае і сучаснасць амерыканскага футбола, то зусім не.

Футбол за акіян, натуральна, прывезлі англійскія перасяленцы яшчэ ў другой палове XIX ст. Цяжка паверыць, але першы футбольны клуб у ЗША быў заснаваны ў далёкім 1862 годзе, за год да паўстання Кастуся Каліноўскага. Гэта ўсяго толькі на пяць гадоў пазней за першы клуб у Англіі «Шэфілд Юнайтэд».

У 1885 годзе ў Ньюарку амерыканцы правялі першы таварыскі матч. Супернікамі былі суседзі па кантыненце з Канады. Амерыканцы саступілі 0:1, але яны не любяць узгадваць той эпізод са сваёй гісторыі.

Амерыканцы выводзяць сваю гісторыю з 1916 года, калі ў Стакгольме мінімальна перамаглі шведаў — 3:2. Пачынаць радавод з перамогі ўсё ж значна больш прыемна.

На першым чэмпіянаце свету, што праходзіў у далёкім 1930 годзе ва Уругваі, амерыканцы былі аднымі з заканадаўцаў футбольных модаў. На групавым этапе «зорна-паласатыя» без асаблівых цяжкасцяў разграмілі Парагвай і Бельгію. У матчы з лацінаамерыканцамі тры галы забіў Берт Пейтэнаўд — гэта быў першы хет-трык мундыяляў.



**Клінту Дэмпсі (у цэнтры) дапамог англійскі галкіпер.**

Амерыканцы выйшлі ў паўфінал, але там аргенцінцы не пакінулі ім ніякіх шанцаў.

Дарэчы, у Амерыцы футбол называюць не на еўрапейскі капыл, а на свой — сокер. Справа ў тым, што ў свой час гэтая гульня афіцыйна называлася association football, каб адрозніць ад рэгбі (rugby football). У амерыканскай жа традыцыі ў вымаўленне ўвайшло скарачэнне association football. Такую самую назву ўжываюць у Канадзе, Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, Японіі.

У выпадку Амерыкі гэта было неабходна яшчэ з той прычыны, што шырокую папулярнасць у краіне атрымаў футбол амерыканскі — гэта гібрыд футбола і рэгбі.

Пастуова футбол у ЗША пачаў значна саступаць у глядацкіх прыярытэтах хакею, баскетболу, бейсболу, амерыканскаму футболу. Калі амерыканскі хлопец мае спартовы цела-склад, то ён найперш пойдзе ў баскетбольную ці бейсбольную секцыю, і толькі пасля ў футбольную.

Цікавы факт, што на афіцыйным сайце амерыканскай федэрацыі змешчаныя правілы гульні ў футбол. Такога вы не знойдзеце амаль нідзе. А вось жаночы футбол у Амерыцы папулярны. Іх зборная адна з наймацнейшых на планеце.

Новы віток развіцця гульня №1 атрымала ў Штатах пасля чэмпіянату свету 1994 года, які праходзіў на іх стадыёнах. Там амерыканцы прайгралі ў 1/8 фіналу толькі будучым чэмпіёнам з Бразіліі.

У 2002 поспех ЗША быў яшчэ большым. Каманда змагла трапіць у васьмёрку наймацнейшых.

Сённяшняя каманда ЗША — гэта не хлопчык для біцця. Большасць гульцоў гэтай зборнай выступае ў моцных еўрапейскіх клубах. Той жа брамнік Цім Говард абараняе колеры ліверпульскага «Эвертана», які прыязджаў летась у Мінск для змагання з БАТЭ.

Яшчэ адзін крок, на які ідуць амерыканцы, каб прыцягнуць заўзятараў на футбольныя матчы, — прыцягненне ў свае каманды зорных гульцоў.

Ці не першапраходцам у гэтым плане быў славуты Пеле, які тры сезоны на схіле кар'еры пыліў за «Нью-Ёрк Космас». З апошніх прыкладаў — гэта Дэвід Бэкхэм, які пагуляў за «Лос-Анжэлес Гэлаксі». Гулялі ў ЗША таксама балгарын Хрыста Стоічкаў, немец Лотар Матэус, француз Юры Джаркаеф. Такія ўкладанні таксама даюць вынік.

Між іншым, у невялікім гарадку Сэнт-Пол, што ў штаце Мінесота, дзяцей у футбол вучыць гуляць чэмпіён СССР у складзе мінскага «Дынама» Сяргей Гоцманаў.

У сваім Паўночнаамерыканскім дывізіёне годнае суперніцтва Штатам могуць прапанаваць толькі мексіканцы. Магчыма, сюрпрыз першай гульні не быў апошнім.

Дарэчы, момант з удзелам Дэмпсі і Грына, які мы ўзгадвалі ў пачатку артыкула, ужо меў месца ў гісторыі. У 1950 годзе, на першы пасляваенны мундыяль, упершыню вырашылі прыехаць англічане. Раней яны лічылі ніжэй за сваю годнасць удзельнічаць у падобных спаборніцтвах, бо лепш за іх гуляць у футбол усё адно ніхто не мог.

Амерыканец Уолтэр Бар, не знайшоўшы лепшага выйсця, проста стукнуў мячом, што ёсць моцы, у бок англійскіх варот. І галкіпер быў гатовы прыняць мяч, каб ён не сутыкнуўся з галавой ураджэнца Гаіці Джо Гецьенса. Амерыканцы выйгралі той матч. А англічане ўпершыню задумаліся, ці гуляюць яны лепш за астатніх.

**Зміцер Панкавец**

# Чужы сярод сваіх

**Колькі сербаў пасля фінальнага свістка матча Сербія — Гана праклінáлі свайго суайчынніка Мілавана Раеваца!**

Рэч у тым, што ў гэтай гульні па розныя бакі барыкад сышліся два сербскія спецыялісты — Радамір Анціч і Мілан Раевац. Такім чынам, апошняму даводзілася змагацца супраць сваёй краіны.

І на 84-й хвіліне Гана такі вырвала перамогу, дзякуючы пенальці, што рэалізаваў Азамоа Г'ян.

«Мы шчаслівыя, што афрыканская зборная перамагла добрую еўрапейскую каманду, — сказаў пасля гульні Раевац. — Гэта самая важная перамога ў маёй трэнерскай кар'еры. Але мне шкада сербаў. Я бачыў расстроеныя твары футбалістаў пасля гульні. На дадзены момант я працую на карысць футбола Ганы, хаця спадзяюся, што мае суайчыннікі выйграюць дзве астатнія гульні».

«Я жыў са сваёй камандай два гады, трэніраваў яе, каб выйсці на Кубак свету і паказаць сябе», — кажа Раевац.

Трэнерскі лёс часта непрадказальны. Не маючы прызнання на Радзіме, настаўнікі нярэдка вымушаныя шукаць шчасця ў далёкіх краях.

Былы трэнер хакейнай зборнай Беларусі Глен Хэнлан заўсёды прызнаваўся, што ягоная мара — выйграць у канадцаў. У футбольнага трэнера беларусаў Бернда Штанге нешта падобнае ледзь не ўдалося. Ягоныя гадунцы два гады таму сыгралі ўнічыю з немцамі.

Такія матчы — гэта магчымасць засвяціцца на Радзіме, нагадаць пра сябе. Атрымаць права на лепшы і больш выгадны кантракт, таму трэнеры гэтак імкнуцца ім скарыстацца.

Дарэчы, цікавыя абставіны, што толькі адну з шасці афрыканскіх зборных не трэніруе дамарослы спецыяліст. Гэта зборная Алжыра, якую ўзначальвае Рабах Саадан.

А вось краіны «чорнай Афрыкі» ставяць спрэс на легіянераў. Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку трэніруе бразілец Карлас Парэйра, Камерун — француз Поль ле Гуэн, Нігерыю — швед Ларс Лагербек, Кот-д'Івуар — швед Свен-Горан Эрыксан, Гану — серб Мілаван Раевац.

Афрыканскія каманды за апошні час дасягнулі немалога прагрэсу. Амаль у кожнай зборнай ёсць першакласныя гульцы, якія абараняюць колеры найлепшых еўрапейскіх клубаў. Але на трэнерскай ніве афрыканцы па-ранейшаму не давяраюць сваім. Кажуць, што з замежнікамі гульцы будуць трымаць большую дысцыпліну.

Пакуль для афрыканскіх каманд найбольшым поспехам быў выхад у чвэрцьфінал. У 1990-м гэта рабіў Камерун пад кіраўніцтвам савецкага спецыяліста Валерыя Няпомняшчага, а ў 2002 — Сенегал (трэнер — француз Ражэ Лемер).

Ці атрымаецца Раевацу пераўзысці гэтыя дасягненні?

**ЗП**

## Сцісла

• **Першы гол чэмпіянату на рахунку 25-гадовага футбаліста зборнай ПАР Сафіве Чабалалы.** На Радзіме ён гуляе за клуб «Кайзер Чыфс», а за зборную правёў паўсотні паядынкаў.

• **Матч адкрыцця абслугоўвала інтэрнацыянальная судзейская брыгада.** Галоўным суддзёй у полі быў узбек Раўшан Ірматаў. Дапамагалі яму ягоны суайчыннік Рафаэль Ілясаў, а таксама кіргіз Бахадыр Кучкараў. Цікава, што адбывалася гэта амаль у той самы дзень, як у Ошы пачаліся кіргізска-узбекскія супрацьстаянні.

• **Самую буйную перамогу пакуль атрымалі немцы.** Яны без асаблівых цяжкасцяў разабраліся з Аўстраліяй — 4:0. Дарэчы, немец Падольскі стаў першым нападаючым, што забіў на першынстве. Да яго дзесяць мячоў забівалі выключна абаронцы і паўабаронцы.

**ЗП**



**Дыега Марадона, славуты трэнер аргенцінцаў. Першы матч аргенцінцы выйгралі, хоць і прапускалі адзін галявы момант за другім.**

# «Яны хочуць, каб мы дыхалі хіміяй»

Жыхары вёсак Гарні, Шырокая і Даліна, што ў Лідскім раёне, пратэстуюць супраць пабудовы завода паблізу ад іх сяліб.

Завод гарачага цынкавання металаканструкцый лідскія ўлады запланавалі пабудаваць за 300 метраў ад вёскі Даліна і за 800 метраў ад самой Ліды. «У нас няма пэўнасці, што ачыстка выкідаў будзе 100% і што ў нас не будуць ісці «кіслотныя» дажджы. Вытворчасць гэтая новая, для Беларусі малавывучаная, таму наступствы невядомыя», — трывожацца людзі.

Жыхары Лідчыны спрабавалі пісаць лісты ў Адміністрацыю прэзідэнта і звярталіся да мясцовай улады. Чыноўнікі ў адказ запэўніваюць, што прадпрыемства не парушыць ніякіх нормаў. Падчас сустрэчы з насельніцтвам прадстаўнікі мясцовай улады распавядалі пра выгады ад новага завода: ён дасць раёну аж 130 новых працоўных месцаў. Праўда, на тую сустрэчу цяжка было патрапіць. Людзі абураюцца, што пра яе папярэдзілі позна ўвечары, а прызначаная сустрэча была на заўтра, на 14.00 — і гэта ў працоўны дзень. Таму не ўсе змаглі прысутнічаць і выказацца, а хто і прысутнічаў — цяпер з крыўдай паказвае публікацыю «Ложное представление против очевидной выгоды» ў раённай «Лідскай газеце». Там іх меркаванне амаль праігнараванае.

«Вы хаця б не напішаце, што мы не супраць будаўніцтва?» — недаверліва пыталіся людзі ў журналістаў «НН». За пятнаццаць хвілін размовы пра завод ля крыжа ў вёсцы Шырокая сабралася болей за трыццаць мясцовых жыхароў.

**Гарачае цынкаванне**

вядомы ва ўсім свеце спосаб абароны сталёвых канструкцый ад карозіі. Працэс нанясення на сталь пласта цынку ажыццяўляецца ў выніку пагружэння сталёвага элемента ў вадкі цынк (тэмпература ванны 440–460 ° C). Гарачаацынкаваныя вырабы валодаюць падвышанымі характарыстыкамі трываласці, а тэрмін іх эксплуатацыі павялічваецца да 50 і больш гадоў.

«Навошта нам будаваць у нашых гарадах завод? У нас што, мала тэрыторый у Беларусі ў лясах ці далей ад горада? Яны ўсё лічаць эканамічную выгаду, бо тут чыгунка праведзеная. І ніхто не думае пра здароўе людзей. Мы ж усе ведаем, што такое хімічнае прадпрыемства. Кажуць, будуць стаяць фільтры, але пройдзе час і фільтры выйдуць са строю. У Лідзе ж такія спецыялісты, што новыя не набудуць, бо дорага каштуюць. Мы супраць гэтага завода каля нашых хатаў», — кажуць людзі.

«Мы хочам, каб да нас маглі дзеці і ўнукі прыехаць, сарваць яблык і з'есці яго без рызыкі атруціцца, — расказвае мясцовы жыхар. — Хай нас не супакойваюць, што гэта бяспечна. Мы не лыкам шытыя, у мяне вышэйшая адукацыя, я энергетык. Я на свае вочы бачу: вось там завод «Оптык», дык побач нават дрэвы не хочуць расці. Навошта нам яшчэ адзін шкодны завод?»

Людзі расказваюць, што ад ачышчальных збудаванняў «Оптыка», што за кіламетр ад вёскі Шырокая, увечары ідзе такі смурод, што дыхаць няма чым.

«Калі Ліда была адным з самых зялёных гарадоў, мы ганарыліся гэтым. Цяпер яны хочуць, каб мы дыхалі хіміяй і елі цынк, мы будзем змагацца супраць гэтага наколькі магчыма».

Людзі, даведзеныя да адчаю адпіскамі чынавенства, гатовыя выходзіць «з віламі», каб адстаяць свае правы жыць у чыстым асяроддзі. Ужо сабрана болей за дзве тысячы подпісаў ад жыхароў суседніх вёсак і бліжэйшых да будучага завода раёнаў горада Ліды.

**Настасся Шамрэй**



Жыхары Шырокай усталі сцяной супраць небяспечнай будоўлі.

**КАМЕНТАР**

**Ірына Сухій, актывіст экалагічнага руху «Экадом»:**

Ёсць недахоп інфармацыі: не зразумела, якая там тэхналогія, якія плануюцца ачышчальныя меры. Беларусь падпісала Орхускую канвенцыю, паводле якой будаўніцтва шкодных вытворчасцей павінна абмяркоўвацца з зацікаўленымі асобамі, у дадзеным выпадку з жыхарамі, на этапе планавання. Яшчэ да пачатку будаўніцтва, каб была магчымасць вырашыць, будаваць тут ці ў іншым месцы.

У жыхароў ёсць усе правы запытаць інфармацыю пра дадзеную вытворчасць. Калі яны палічаць, што іх правы парушаныя, могуць пайсці ў суд.

# Цяжкасці атлетыкі ў Гомельскім універсітэце

Канфлікт установы і прыватніка. Хто мае рацыю?

У студэнцкім інтэрнаце зачынілася трэнажорная зала, якую трымаў прадпрымальнік. Рэктара не спынілі сотні подпісаў студэнтаў і рэкамендацыі міністра адукацыі.

Гомельскі прадпрымальнік Віктар Краўчанка ў цяжкай атлетыцы з 14 гадоў. Студэнтам ездзіў на трэніроўкі ў другі канец горада, бо ў родным інтэрнаце №4 не было ўмоў. Менавіта там у 2005 годзе Віктар і адчыніў трэнажорную залу, здзейсніўшы сваю студэнцкую мару. Арандаваў у інтэрнаце Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Скарыны памяшканне, адрамантаваў і абсталяваў яго.

Студэнты ГДУ займаліся па льготных цэнах, кітайскія студэнты — увогуле бясплатна. Залу наведвалі і жыхары двух мікрараёнаў Гомеля. Прыходзілі мужчыны і жанчыны ўсіх узростаў, а таксама дзеці і падлеткі. У зале Краўчанкі можна было займацца не толькі цяжкай атлетыкай. Наведнікам прапаноўваліся заняткі па карэкцыі фігуры, лячэбная фізкультура. Спартыўныя поспехі Краўчанку чакалі ў паўэрліфцінгу: пад яго кіраўніцтвам выгадаваліся адзін майстар спорту і пяць кандыдатаў у майстры.

Аднак на пачатку 2010 года рэктар універсітэта Аляксандр Рагачоў адмовіўся працягнуць дамову арэнды.

Па словах Краўчанкі, сваю адмову кіраўніцтва ВНУ матывавала перарасходам электраэнергіі. Аднак гэты факт не пацвердзіўся. Тады бізнесоўцу заявілі, што ўніверсітэт мае патрэбу менавіта ў гэтым памяшканні.

Віктар Мікалаевіч наведаўся ў Міністэрства адукацыі. Студэнты ГДУ са свайго боку даслалі ў Мінадукацыі калектыўны ліст з 200 подпісамі з просьбай пакінуць ва ўніверсітэце трэнажорную залу. Кітайскія студэнты звярталіся ў сваё пасольства з просьбай паспрыяць Краўчанку. Міністр Аляксандр Радзькоў узяў бок студэнтаў і прадпрымальніка, рэкамендаваўшы працягнуць дамову.

Аднак рэктар, кажа Віктар, вырашыў ісці да апошняга. Тым больш, што цяпер Мінадукацыі можа толькі рэкамендаваць, каму і на якіх умовах здаваць у арэнду вольныя плошчы. Краўчанка сцвярджае, што рэктар Рагачоў нібыта паабяцаў першы паверх інтэрната аднаму з банкаў. Але калі ў справу ўключылася Мінадукацыі, рэктар заявіў, што мае патрэбу ў пашырэнні плошчы пад заняткі фізвыхаваннем, таму і не працягвае кантракт з прадпрымальнікам.

30 мая Краўчанка вывез з арандаванай залы абсталяванне. Ён адшукаў новае памяшканне ў тым жа раёне, цяпер чакае аўкцыёну. «Спадзяюся, што пачну працу праз некалькі месяцаў. Людзі чакаюць», — кажа Віктар.

### «Мы не зусім правільна паступілі з самага пачатку»

Рэктар універсітэта Аляксандр Рагачоў кажа, што рашэнне здаваць у арэнду памяшканне ў інтэрнаце №4 было памылковым ад самага пачатку, бо будынак інтэрната некалькі гадоў патрабуе капітальнага рамонту. А акурат з-за трэнажорнай залы яго і не маглі распачаць, патлумачыў Аляксандр Уладзіміравіч. Па яго словах, да кіраўніцтва ўніверсітэта паступілі просьбы студэнтаў адчыніць новую залу. «І мы гэта зробім. Толькі ў нас заняткі будуць бясплатныя. Вы ж разумееце, што для студэнта 40—50 тысяч рублёў зусім не лішнія». Рэктар расказаў таксама, што на гэтыя мэты ўжо закупілі рыштунак на 40 мільёнаў рублёў. Рыхтаваць будучых спартоўцаў будзе вопытны трэнер Уладзімір Галавач, які выгадаваў больш за 40 майстроў спорту.

Акрамя таго, пасля рамонту на другім паверсе інтэрната адчыніцца чытальная зала з доступам у інтэрнэт.

Словы Віктара Краўчанкі пра намеры аддаць памяшканне ў арэнду аднаму з банкаў кіраўнік універсітэта не пацвердзіў.

### «Абавязкова вярнуся да Краўчанкі»

Аляксандр Кажамякін, які пад кіраўніцтвам Віктара Краўчанкі стаў майстрам спорту, з цеплынёй узгадвае час, праведзены ў «трэнажорцы» ў інтэрнаце №4. Ён стаў майстрам спорту тры гады таму, пасля ў яго спартовую кар'еру ўмяшалася складаная траўма. Цяпер Аляксандр аднавіўся і гатовы працягнуць трэніроўкі. «Абавязкова вярнуся да Краўчанкі, калі ён знойдзе новае памяшканне. Я прывык да працы з Віктарам Мікалаевічам».

**Сямён Печанко**

# У Барысаве прапануюць садзіць чыноўнікаў, а не дрэвы

Разагнаны мітынг жыхароў, якія пратэставалі супраць пабудовы АЗС.

14 чэрвеня ў барысаўскім мікрараёне Лядзішча пачаўся несанкцыянаваны мітынг мясцовых жыхароў. Людзі пратэставалі супраць пабудовы запраўкі ў рэкрэацыйнай зоне, каля вайсковага шпіталя.

Мясцовы праваабаронца Аляксандр Абрамовіч, які падаваў заяўку на мітынг і не атрымаў дазволу, быў затрыманы міліцыянтамі. Яго пасадзілі ў аўто і спрабавалі адвезці ў пастарунак, але мітынгоўцы абкружылі легкавік і не давалі яму з'ехаць.

Як паведаміла адна з пратэстоўцаў Тамара Каважэнка, якая на апошніх парламенцкіх выбарах змагалася за дэпутацкі мандат з вайскоўцам, гэта быў ужо другі мітынг мясцовых жыхароў. Першы сабраў 28 мая больш за 200 чалавек, ён таксама быў несанкцыянаваны. Тады ўлады не наважыліся разганяць жыхароў мікрараёна і прапанавалі ім правесці сход у мясцовай школе.

На сходзе прысутнічалі прадстаўнікі РУП «Беларуснафта-Мінскаблнафтапрадукт», каму належыць будучая запраўка, прадстаўнікі мясцовай улады. Напрыканцы сходу намеснік старшыні Барысаўскага райвыканкама Віктар Саковіч заявіў прысутным, што рашэнне наконт будаўніцтва АЗС з улікам меркавання мясцовых жыхароў будзе падрыхтаванае да 14 чэрвеня. Аднак да панядзелка людзі так і не пачулі адказу ад уладаў.

На пытанне карэспандэнта «НН», якое рашэнне па будаўніцтве АЗС усё ж прыняў выканкам, Віктар Мікалаевіч шчыра прызнаўся, што не ведае. «Не займаюся гэтым пытаннем».

Па словах Тамары Валянцінаўны, мясцовыя жыхары прапанавалі чатыры пляцоўкі для пабудовы заправачнай зоны, якія знаходзяцца па-за тэрыторыяй жылой зоны. Акрамя таго, абурэнне месцічаў выклікала тое, што пры падрыхтоўцы будаўнічай пляцоўкі былі спілаваныя дзясяткі соснаў.

На сходзе прадстаўнік «Беларуснафты» паабяцаў пасадзіць узамен 2000 дрэваў. У адказ абураныя жыхары заявілі, што «садзіць трэба не дрэвы, а чыноўнікаў».

Мікрараён Лядзішча і суседні з ім Дымкі сумнавядомыя сваімі штогадовымі падтапленнямі падворкаў прыватнага сектара. Цяпер з месяца пабудовы АЗС людзям прывозяць за немалыя грошы пясок. Гэта яшчэ адзін момант, які абурае людзей. Адно з патрабаванняў — адкліканне дэпутата ад 7-й выбарчай акругі палкоўніка Валерыя Гнілазуба.

На сёння пад патрабаваннямі спыніць будаўніцтва АЗС падпісаліся каля 1700 мясцовых жыхароў. Дапамагалі ў зборы подпісаў і сябры грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду».

**Сямён Печанко**

# Лёсы падазраваных

Восенню 2008 года Еўрасаюз замарозіў візавыя санкцыі ў дачыненні амаль усіх беларускіх чыноўнікаў, што ўваходзілі ў спіс невыязных. Паранейшаму не могуць трапіць на Захад толькі старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, а таксама чацвёра падазраваных у гучных знікненнях (Віктар Шэйман, Юры Сівакоў, Дзмітры Паўлічэнка і Уладзімір Навумаў).

Які лёс напаткаў гэтых асобаў?

## Па загадзе Шэймана

7 мая 1999 г. знік былы міністр унутраных справаў Юры Захаранка. Потым у верасні раптоўна прапалі палітык Віктар Ганчар і бізнесмен Анатоль Красоўскі, яшчэ праз год — тэлеаператар Дзмітры Завадскі.

У выніку следства генерал-маёр міліцыі Мікалай Лапацік прадставіў рапарт на імя міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава. У запісцы Лапацік, на аснове матэрыялаў, сабраных следчымі, абвінаваціў Віктара Шэймана ў тым, што той даў загад на знішчэнне Юрыя Захаранкі. А загад выконваў Дзмітры Паўлічэнка пры дапамозе Юрыя Сівакова, які забяспечыў групу пісталетам ПБ-9, часова забраным з мінскага СІЗА №1.

Паўлічэнка нават апынуўся па справе ў ізалятары, але хутка быў адтуль вызвалены. У ордэры адзначалася, што «Паўлічэнка з'яўляецца арганізатарам і кіраўніком крымінальнай структуры, якая мела дачыненне да выкрадання і забойства людзей».

У чэрвені 2001 года, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, новую інфармацыю па справе зніклых далі былыя следчыя рэспубліканскай пракуратуры Дзмітры Петрушкевіч і Алег Случак.

Яны заявілі, што ў краіне існуе так званы «эскадрон смерці», які быў створаны міністрам унутраных справаў Юрыем Сіваковым па загадзе сакратара Рады бяспекі Віктара Шэймана. Па інфармацыі следчых, брыгаду ўзначальваў Дзмітры Паўлічэнка. Пасля адстаўкі Сівакова «эскадрон» нібыта перайшоў пад кантроль Уладзіміра Навумава. Петрушкевіч і Случак паведамілі, што групай было здзейснена блізу 30 забойстваў.

Пасля даклада кіпрскага дэпутата Рады Еўропы Хрыстаса Пургурыдэса згаданым дзяржаўным асобам быў забаронены ўезд у краіны Еўропы.

## Віктар Шэйман

Пасаду дзяржсакратара Рады бяспекі Віктар Шэйман страціў пасля мінскага выбуху на Дзень Рэспублікі ў 2008 годзе. Да гэтага ён быў фактычна другім чалавекам у краіне.

«Не думаю, што Вы павінны заставацца на гэтай пасадзе пасля інцыдэнту. Вы вінаватыя, перш за ўсё! Вы паводле даручэння прэзідэнта не адзін год, а дзесяць гадоў арганізуеце падобныя мерапрыемствы. І нічога не зрабілі!» — эмацыйна выказваўся тады Лукашэнка.

І Шэйману давялося пакінуць свой кабінет. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, вырашальную ролю ў адстаўцы ўсемагутнага Шэймана сыграў часовы хаўрус між міністрам унутраных справаў Навумавым (ён заўсёды недалюбліваў Шэймана) і Віктарам Лукашэнкам. Яны абвінавацілі ў выбуху якраз кіраўніка Рады бяспекі.

Як здавалася тады, Шэйман паў. Але не для таго гэты чалавек на працягу многіх гадоў старанна заваёўваў уплыў і ўладу, каб так лёгка яе здаваць.

Хоць Шэйман і пазбавіўся сваёй асноўнай працы, але пакінуў за сабой місію ў беларуска-венесуэльскай сумеснай камісіі высокага ўзроўню. Ужо праз пару тыдняў пасля адстаўкі ён сустракаў у аэрапорце «Мінск-2» Уга Чавэса, а праз месяц сам накіраваўся ў Каракас.

На беспартфельнай працы ўраджэнец Воранаўскага раёна прабыў амаль паўгода. У студзені летась стала вядома аб прызначэнні Шэймана на пасаду пасла па асаблівых даручэннях. Ягоны новы кабінет, хоць і не такі шыкоўны, як папярэдні, месціцца ў будынку Адміністрацыі прэзідэнта па адрасе вуліца Карла Маркса, 38.

Цікава, што «асабліва важныя даручэнні» Шэйман атрымлівае ў асноўным на Лацінскую Амерыку. У Венесуэле гэты чалавек стаў ужо амаль як родны.

Вось і зусім нядаўна чыноўнік вярнуўся з чарговага турнэ з той часткі планеты. Падчас візіту Шэйман наведаў Кубу, Эквадор, Балівію і, канечне ж, Венесуэлу.

Дарэчы, з Лацінскай Амерыкай звязаны і адзін скандал, у які трапіў Шэйман. У маі 2008 года Інтэрпол пацвердзіў сапраўднасць ноўтбука з электронным лістом лідэра калумбійскіх партызанаў, у якім той гаворыць, што венесуэльскі прэзідэнт Уга Чавэс спрабуе ўзброіць калумбійскіх паўстанцаў з дапамогай Беларусі.

Іспанская El Pais сцвярджала, што найлепшым сябрам калумбійцаў мог аказацца ўжо былы дзяржаўны сакратар Рады бяспекі Віктар Шэйман. Менавіта ён быў адным з тых, хто прабіваў кантракты на пастаўку зброі ў Венесуэлу.

Заапошні час Шэйман пафарбаваўся, стараўся змяніць імідж. На сустрэчах з Чавэсам ці Маралесам Шэйман часта апранае вайсковую форму, а таксама мноства ордэнаў і медалёў.

Шэйман зноў узмацняе свае пазіцыі і аўтарытэт. Пагаворваюць, што ён зноў можа вярнуцца ва ўладу. Прынамсі, яму сватаюць пасаду старшыні Камітэта дзяржкантролю на месца пенсіянера Ломаця. Але ці адважыцца Лукашэнка вярнуць такога паплечніка?

## Юрый Сівакоў

Сівакоў быў першым з падазраваных, хто сышоў у цень. У 2005 годзе яго знялі з пасады міністра спорту і турызму. Дарэчы, на гэтай пасадзе Сівакоў адзначаўся ці не найбольшым дэмакратызмам сярод сваіх калег. Прынамсі, ніколі не падзяляў журналістаў на «чэсных і нячэсных», як сталі рабіць ягоныя наступнікі.

Танкіст Сівакоў на няпрофільнай для сябе пасадзе спрабаваў разабрацца з карупцыяй, што квітнела ў ягоным ведамстве. З адстаўкай Сівакова гэтая барацьба заціхла.

Склаў Сівакоў з сябе таксама абавязкі старшыні рады Беларускай асацыяцыі ветэранаў спецпадраздзяленняў войскаў МУС «Гонар».

Цяпер жа Юры Сівакоў займае сціплую пасаду прарэктара па выхаваўчай працы Мінскага інстытута кіравання — прыватнай ВНУ. З'яўляецца па сумяшчальніцтве дацэнтам кафедры працоўнага і крымінальнага права. Чытае курс крыміналогіі і крымінальна-выканаўчага права.

30 кастрычніка 2007 года рашэннем ВАК прысвоенае вучонае званне «дацэнт права». З калегамі Сівакоў імкнецца трымаць пэўную дыстанцыю.

## Дзмітрый Паўлічэнка

Першы камандзір спецыяльнага атрада хуткага рэагавання ўнутраных войскаў МУС палкоўнік Дзмітры Паўлічэнка пайшоў у адстаўку яшчэ ў сакавіку летась.

Афіцыйна Паўлічэнка звольнены з вайсковай службы ў сувязі з хваробай. Апошняя пасада, якую ён займаў, — намеснік камандзіра корпуса аховы грамадскага парадку ўнутраных войскаў МУС па баявой падрыхтоўцы.

На яе Дзмітры быў прызначаны ў лістападзе 2008 года. Перад гэтым камандаваў брыгадай спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС (в/ч 3214, Уручча, Мінск).

Хадзіла мноства чутак, што Паўлічэнка быў шпіталізаваны, што ў яго быў інсульт. Але нешматлікія з'яўленні перад журналістамі даказвалі, што Паўлічэнка ў добрым стане. Хворы чалавек на Вадохрышча ў палонку не палезе.

Апошні раз на публіцы ён з'явіўся падчас выставы «СМІ ў Беларусі».

Пра тое, што Паўлічэнка мог трапіць у апалу, можа сведчыць хаця б той факт, што ў сакавіку з'явілася інфармацыя аб арышце ягонага роднага брата.

У МУС пацвердзілі, што брат Паўлічэнкі, доктар, затрымліваўся КДБ праз знікненне шэрагу наркатычных сродкаў з Рэспубліканскай турэмнай бальніцы, якая падпарадкоўваецца Дэпартаменту выканання пакаранняў. Але падрабязнасці той справы невядомыя.

## Уладзімір Навумаў

Былы міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў летась спачатку згубіў міністэрскі фатэль, а потым і пасаду ў Федэрацыі хакея.

Генерал-лейтэнант Навумаў цяпер працуе ў Маскве на пасадзе дарадцы Сяргея Чэмезава, генеральнага дырэктара дзяржаўнай карпарацыі «Растэхналогіі». Гэтая структура знаходзіцца пад асабістым кантролем Уладзіміра Пуціна.

Кажуць, што Навумава з'ехаць у Маскву фактычна прымусілі, у праціўным выпадку пагражаючы крымінальнай справай і зняволеннем. Тым не менш, сам Навумаў кажа, што бывае ў Мінску, хоць «па Радзіме яшчэ не паспеў засумаваць».

Цікава, што нядаўна дыпламатычную пасаду ў Жэневе страціў і сын Навумава Захар.

**Зміцер Панкавец**



**Генерал Сівакоў працуе прарэктарам прыватнай ВНУ. Фатаграфаваць сябе ён не дазваляе. А ў свабодны доступ выставіў толькі вось гэтае сонечнае фота.**



**Віктар Шэйман курсуе ў Амерыцы ад сталіцы да сталіцы. На фота: 5 чэрвеня ён сустракаўся з прэзідэнтам адной з найбяднейшых краінаў кантынента — Балівіі — Маралесам.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Мінску ўпарта хадзілі чуткі пра выкраданне і арышт Навумава.**





АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Паўлічэнка апошні раз з'яўляўся на публіцы падчас выставы «СМІ ў Беларусі». У нязменнай скуранцы.**



**Праз такога пасланніка Уга Чавэс можа вырашаць самыя сакрэтныя справы.**

# Дэбют Шапіры
## коштам у мільярд рублёў

4–6 чэрвеня ў Гродне прайшоў рэспубліканскі Фестываль нацыянальных культур.

### Давыд Гарадзенскі і Алег Газманаў

Гонар адкрыць Фестываль выпаў Сямёну Шапіру — новаму кіраўніку вобласці. Яму дапамагалі міністр культуры Павал Латушка і кіраўнік гродзенскага гарвыканкама Барыс Казялкоў.

У афіцыйных прамовах не абышлося без перапеваў нядаўняга выказвання А.Лукашэнкі аб адсутнасці ў Беларусі нацыянальных меншасцяў. Далей распачалася тэатралізаваная цырымонія. Рэжысёр У.Сяргейчык здолеў сумясціць несумяшчальнае — Давыда Гарадзенскага на газоне стадыёна змянялі партызаны і вялізная чырвоная зорка, а іх — дзеці ў светлых балахонах.

Пасля іх з'явіўся Алег Газманаў. Ён не вельмі разумеў, дзе знаходзіцца (блытаўся ў назве свята), але затое падскокваў, адціскаўся і круціў сальта. Пасля грымнуў святочны салют.



Рыначнік Шапіра танчыць пад літоўскі аркестр. У ладкі пляскае старшыня гарвыканкама Казялкоў.

### «Дзевачкам таксама наліце»

Прадстаўнікі нацыянальнасцяў, што жывуць у Беларусі, павінны былі дэманстраваць асаблівасці сваіх культур на нацыянальных падворках. Сёлета ў Гродне такіх падворкаў паўстала 26. Таму афіцыйная дэлегацыя скарыстала праверaную тактыку валачобнікаў: падзялілася на дзве групы. Адну ўзначаліў С. Шапіра, а другую — П.Латушка.

Новы кіраўнік Гродзенскай вобласці ад пачатку выклікаў усеагульную цікавасць. Як жа — рыначнік, дэмакрат, а ў старыя часы нават быў сябрам АГП.

Усе памяталі кураж, з якім наведваў падворкі яго папярэднік — Уладзімір Саўчанка. Шапіра пачаў абыход з роднага беларускага падворка і спачатку быў стрыманы ў паводзінах. Аднак ужо ў гасцях у палякаў пусціўся ў настальгічныя развагі аб тым, што наведваў сярэднюю школу дзеля пончыкаў (акурат пончыкамі частавалі губернатара сябры афіцыйнага СПБ. Сябры неафіцыйнага Саюза палякаў святкавалі асобна). А калі дэлегацыя на чале з кіраўніком вобласці дабралася да ўкраінскага падворка, Шапіра па-кампанейску пачаў уздымаць чарку з гараджанамі, уладарна загадваючы: «Дзевачкам таксама наліце».



Павал Латушка на азербайджанскім падворку каштаваў каньяк, казаў тосты і рабіў характэрныя жэсты.



Губернатар і народ былі адзінымі ў памкненнях.

### Галандская Sex Bomb

Павал Латушка, абыходзячы сваю дзялянку, уручаў сімвалічныя ключы ад Беларусі, казаў прамовы і тосты. На азербайджанскім падворку нават узняў кілішак каньяку за журналістаў.

Следам за начальствам далучаліся да культурнай разнастайнасці тлумы шараговых грамадзян. Сярод імправізаваных выспаў нацыянальных культур асабліва выдзялялася галандская. У той час як большасць нацыянальнасцяў танчыла пад свае народныя песні, галандцы адрываліся пад Sex Bomb, размахваючы аранжавымі сцягамі ды дэманструючы найлепшыя ўзоры сучаснай гарадской артыстычнай культуры Захаду. Гэткі кавалак Нідэрландаў асабліва спадабаўся моладзі, сабраўшы вакол сябе шчыльны натоўп.

На іншых падворках усё было як звычайна — кітайскія балёнікі і танныя цацкі, піва, шашлыкі ды дзяўчынкі ў стракатых нацыянальных касцюмах. Калі б не шыльды ды нацыянальныя сцягі, адрозніць падворкі было б складана.



Самымі адвязнымі на фэсце былі галандцы.



Беларускія арабы паслалі на фэст сапраўдную Шахеразаду.

### Відовішчы за кошт хлеба

Тры дні Фестывалю каштавалі каля мільярда рублёў. На прэс-канферэнцыі кіраўніцтва Гродна запэўнівала, што на 65% Фестываль «з уласнай ініцыятывы» прафінансавалі прадпрыемствы Гродна і рэгіёна. Верыцца ў такую шчодрасць без выкарыстання «адміністратыўнага рэсурсу» з цяжкасцю. Тым больш, што вобласць яшчэ чакаюць лідскія дажынкі, на якія таксама прыйдзецца скідвацца.

Не ўсе жыхары Гродна задаволеныя такімі выдаткамі. Аднак для большасці з іх старое рымскае правіла пра хлеб і відовішчы выдатна працуе і сёння. Людзям хочацца свята. А тое, што яно становіцца ўсё больш аднастайным, павялічваючы адно колькасць удзельнікаў, не мае значэння.

**Алесь Пілецкі, фота Юліі Дарашкевіч**



Шэсце нацыянальных меншасцяў ачольвалі салдаты Другой сусветнай.



Пачастунак на мяжы фолу на падворку праўладнага Саюза палякаў — парасяты Кася і Ясь, упрыгожаныя польскімі нацыянальнымі сцягамі.

# Чалавек, які стварыў «Новый мир»

Пра жыццё і смерць Аляксандра Твардоўскага ў дні ягонага юбілею піша **Віталь Тарас**.



Яўгеній Еўтушэнка калісьці напісаў: «Поэт в России — больше, чем поэт». Гэтыя радкі нярэдка паўтараліся апошнімі днямі — у сувязі з пахаваннем Андрэя Вазнясенскага, аднаго з апошніх «шасцідзясятнікаў». І мала хто задаецца пытаннем: што значыць «больш, чым паэт»? Чым вымераць маштаб паэта альбо эпохі? І ўвогуле, ці нельга быць проста паэтам?

Але парадокс у тым, што менавіта ў яго выпадку вызначэння «паэт» недастаткова. Дастаткова будзе сказаць: галоўны рэдактар «Нового мира». І гэта будзе свайго роду код 1960-х.

### Вось ён я

Твардоўскі нарадзіўся сто гадоў таму — 8 (21) чэрвеня. У той год нарадзілася Ларыса Геніюш і памёр Леў Талстой. Юнацтва Твардоўскага, які нарадзіўся на Смаленшчыне, у сям'і «кулакоў», выпала не проста на эпоху рэформаў — на «вялікі пералом». Сталінскую калектывізацыю ён апяваў у сваёй «Краіне Муравіі».

Сваіх братоў, арыштаваных паводле падазрэння ў антысавецкай агітацыі, Твардоўскі выракся. Бацьку, які збег з высылкі, каб паглядзець, што робіцца ў родным доме, сын выдаў міліцыі.

«Сын за бацьку не адказвае!» — гэтыя сталінскія словы саркастычным рэфрэнам будуць паўтарацца ў паэме Твардоўскага «По праве памяці», якую ён напіша ў сярэдзіне 1960-х і якая будзе апублікавана ў Савецкім Саюзе толькі ў 1987. («Забыть, забыть велят безмолвно, хотят в забвенье утопить живую боль...»)

А перад самай вайной выйшаў хрэстаматыйны «Ленін і пячнік». Усе памятаюць «Ленин? Тут и сел старик!». Але ёсць у гэтым вершы і іншыя радкі, якія чытаюцца сённяшнімі вачыма зусім інакш, чым у савецкай школе:

А по свежей по дорожке
Вдруг к избушке печника
На коне в возке хорошем —
Два военных седока.
Заметалась беспокойно
У окошка вся семья.
Входят гости:
— Вы такой то?
Свесил руки:
— Вот он я…

Аўтар яўна атаясамлівае сябе з няшчасным печнікам, які асмеліўся зрабіць заўвагу Леніну. Як, напэўна, памятае чытач, усё абышлося — печніка не расстралялі, нават не пасадзілі. Праўда, усяго толькі папрасіў яго справіць печку, каб не чадзіла. І нават пахваліў за работу — праўда, не заплаціў. Але чаем літасціва напаіў.

### Герой яго аповесці

Потым будзе вайна, на якой Твардоўскі ваяваў артылерыстам (як і Васіль Быкаў, з якім ён пазнаёміцца пазней). Будзе «Васілій Цёркін». Я не літаратурны крытык і ніколі не вазьму на сябе смеласць ацэньваць паэзію. Але Іван Бунін, які арганічна не выносіў фальшу і асабліва бальшавіцкага пафасу, быў у захапленні ад паэмы Твардоўскага. Паводле многіх яго калег-франтавікоў, паэма фактычна стала першым словам праўды пра вайну.

Так ці інакш, Твардоўскі быў уладай аблашчаны. Лаўрэат трох сталінскіх, адной ленінскай і адной дзяржаўнай прэміі, кандыдат у члены ЦК КПСС, дэпутат Вярхоўнага Савета РСФСР, ардэнаносец.

Як напісаў адзін публіцыст пра Васіля Быкава — усё ў яго было: і званне Героя сацпрацы, і званне народнага, і дача, і аўтамашына. Чаго ж яму не хапала, чаму не хацеў верай і праўдай служыць начальству, якое столькі для яго зрабіла?

Чаму Твардоўскі двойчы пагадзіўся ўзяць пад сваю рэдакцыю савецкі літаратурны часопіс «Новый мир»? Што прымушала яго адчайна змагацца з цэнзурай, ЦК, літаратурным начальствам усіх рангаў?

На XXII з'ездзе КПСС Твардоўскаму далі слова. У яго выступленні было, зразумела, шмат казённых і дзяжурных словаў, усхваленняў палітыкі партыі.

Але было і нешта новае, што гучала зусім нязвыкла ў сценах Палаца з'ездаў.

Ужо на самым пачатку аратар прывёў словы Льва Талстога, якімі ён заканчвае свае «Севастопальскія апавяданні»: «Герой жа маёй аповесці, якога я люблю ўсімі сіламі сваёй душы, якога імкнуўся аднавіць ва ўсёй прыгажосці яго і які заўсёды быў, ёсць і будзе цудоўны, — праўда». Недахоп многіх нашых кніг, працягваў Твардоўскі, — перш за ўсё недахоп праўды жыцця, аўтарскае азіранне, што можна, чаго нельга, то бок недавер да чытача (...)

Калі перад намі чытач, які не валодае так званай лёгкасцю пяра, мастак, якому ўласцівая гэтая пакутлівая няўпэўненасць і сумненні ў сваіх сілах, — а чым больш значны і сур'ёзны мастак, тым менш уласцівая яму самаўпэўненасць, — дык ён, пераадольваючы ўсё гэта, звяртае сваю прамову да чытача ў сілу ўнутранай неабходнасці выказвання, таму што не можа прамаўчаць. І тады на свет з'яўляецца кніга, якая кранае мяне, чытача, да глыбіні душы, кніга, якая ўваходзіць у мой асабісты фонд, кніга, якая складае нейкую частку мяне самога, робіць мяне разумнейшым, лепшым, мацнейшым і больш шчаслівым». (XXII з'езд КПСС. 17–31 кастрычніка 1961 года. Стэнаграфічная справаздача. — Масква 1962).

### «Я адкрыў Салжаніцына»

Такой кнігай вельмі хутка для Твардоўскага і мільёнаў чытачоў яго «Нового мира» стане «Щ 854. Адзін дзень аднаго зэка». Гэтым зэкам быў Аляксандр Салжаніцын. Рэзкае антысталінскае выступленне, з якім Хрушчоў выступіў у завяршэнне таго самага з'езда, падказала, што прыйшоў момант, калі можна і трэба сказаць хоць бы частку праўды пра ГУЛАГ. І Салжаніцын прыйшоў у «Новый мир».

Твардоўскі прапанаваў назваць апавяданне «Адзін дзень Івана Дзянісавіча»...

У «Навамірскім дзённіку», які летась выйшаў асобным выданнем у Маскве, Твардоўскі апісвае сваю сустрэчу з Хрушчовым, якой доўга і ўпарта дамагаўся.

«—Я звярнуўся да Вас, Мікіта Сяргеевіч, з гэтым рукапісам таму, што, шчыра кажучы, мой рэдактарскі досвед з несумненнасцю гаворыць мне, што, калі я не звярнуся да вас, гэтую таленавітую кніжку зарэжуць».

Зарэжуць — з гатоўнасцю пацвердзіў ён. Але Хрушчоў перад тым ужо не толькі прачытаў «Адзін дзень Івана Дзянісавіча». Прэзідыум ЦК КПСС прыняў пастанову аб публікацыі.

А вось вылучэнне аповесці на Дзяржаўную прэмію скончылася правалам. Наменклатурнае літаратурнае начальства зрабіла ўсё, каб расціснуць «шкодную кнігу». А калі скінулі Хрушчова, ідэалагічная зграя канчаткова сарвалася з ланцуга.

У 1965 годзе Камітэт дзяржбяспекі дакладаў, што Твардоўскі наведаў Новасібірск, дзе сустракаўся з чытачамі. «Кажучы пра цяжкасці выпуску часопіса», А.Т. «заявіў, што рэдкалегіі часопіса нялёгка, бо выхад часопіса іншы раз затрымліваецца паводле незалежных ад часопіса акалічнасцяў». Адказваючы на пытанне аб стаўленні да публікацыі Салжаніцына, А.Т. сказаў: «Я адкрыў Салжаніцына, бараньбіта за праўду, і не шкадую аб тым, што друкаваў яго творы».

Пасля «Івана Дзянісавіча» ў «НМ» былі яшчэ надрукаваныя «Матронін двор», «Выпадак на станцыі Крэчэтаўка». А вось «Ракавы корпус» і «У крузе першым» апублікаваць у часопісе не ўдалося. Салжаніцына Твардоўскаму наменклатура не даравала.

### Цёркін на тым свеце

Здымалі галоўнага рэдактара «Нового мира» двойчы. Першы раз — у 1954, за спробу публікацыі ў часопісе «паклёпніцкай і палітычна шкоднай» сатырычнай паэмы «Цёркін на тым свеце». Другі раз — у асабліва цынічнай форме — у 1970-м.

9 лютага на бюро сакратарыята СП СССР адбыўся канчатковы разгром рэдакцыі «Нового мира». Яшчэ за чатыры дні да таго было прынята рашэнне прызначыць наменнікам галоўнага рэдактара часопіса Д. Бальшова. Пасля гэтага Твардоўскі напісаў заяву з патрабаваннем зняць яго подпіс на другой (лютаўскай) кніжцы «НМ» за 1970-ы год. (Бальшоў — у мінулым першы сакратар ЦК ЛКСМБ. У 1966-м, з'яўляючыся галоўным рэдактарам «Советской культуры», напісаў данос на спектакль Тэатра сатыры «Цёркін на тым свеце». Твардоўскі як аўтар паэмы абвінавачваўся ў «зняважэ грамадзянскіх, патрыятычных пачуццяў савецкіх людзей»). Пасяджэнне Бюро не стэнаграфавалася. Са складу рэдкалегіі былі выведзеныя Лакшын, Кандратовіч, Наталля Сац, Віноградаў — галоўныя паплечнікі Твардоўскага. На яго месца быў прызначаны Рычард Касалапаў.

Найбольш актыўным крытыкам былога галоўнага рэдактара выступіў Сяргей Міхалкоў. «Твардоўскі не заўважае, як з ягo на Захадзе лепяць мадэль «галавы апазіцыі». (З дзённіка А.Т.) Калі Твардоўскі заявіў, што не прызнае рашэння бюро і чакае адказу на свой зварот у ЦК, прысутны Аляксандр Чакоўскі здзеклівым тонам запытаўся: «Вы спадзеяцеся на станоўчы адказ?» Усё ўжо было вырашана.

Акрамя таго, што Твардоўскага знялі з пасады галоўнага рэдактара, яго дэманстратыўна не выбралі дэлегатам XXIII з'езда КПСС, а таксама і дэпутатам. І ў той самы час пакінулі ў часопісе некаторых былых супрацоўнікаў пісьменніка. Каб збіць чытачоў з панталыку, зрабіць выгляд, быццам нічога не мяняецца — ідзе нармальная «ракіровачка».

### Як ім спіцца па начах?

Не даравалі Твардоўскаму і шмат іншых публікацый. Сярод іх былі вершы Аркадзя Куляшова, проза Васіля Быкава. Твардоўскаму даводзілася літаральна прабіваць праз галоўліт яго «Мёртвым не баліць», «Атаку сходу», «Круглянскі мост». («Сотнікаў» быў надрукаваны пасля сыходу Твардоўскага.)

Вось што пісаў, напрыклад, савецкі паэт і крытык Мікалай Грыбачоў у «Литературной газете» ў жніўні 1969. «В. Быкаў так піша савецкіх людзей, што незразумела, як мы вайну выйгралі».

Сам Аляксандр Твардоўскі не быў абстрактным маралістам і паводле характару не падобны быў да паэта-лірыка. З тым жа Салжаніцыным яны лаяліся ў рэдакцыі неадноййчы — ледзь не да бойкі. Не праз ідэйныя разыходжанні. Проста ў кожнага былі свае задачы. Твардоўскі найперш думаў пра тое, як ратаваць часопіс. Салжаніцын лічыў, што магчымасці друкавацца легальна ў гэтай краіне ўжо вычарпаныя. «Архіпелаг ГУЛАГ» быў выдадзены ў Францыі. Увосені 1970-га яго аўтар атрымаў Нобелеўскую прэмію. А ў наступным годзе яго дэпартавалі ў Германію.

Аднак Твардоўскі мог самааддана заступацца за маладых таленавітых літаратараў. Напрыклад — за Іосіфа Бродскага, якога ў сярэдзіне 1960-х у Ленінградзе судзілі за «тунеядства». Перакладчык Казлоўскі ўспамінаў, як Твардоўскі на нейкай вечарыне ледзь не пабіўся з Пракоф'евым, які надрукаваў у «ЛГ» артыкул пра поспехі ленінградскіх пісьменнікаў і пра сваю працу з маладымі. Кажуць, Твардоўскі крычаў на яго: «Ты мярзотнік! Ты знішчыў маладога паэта!» — «Ну і што ж? Гэта праўда! Гэта я сказаў Руденку (тагачаснаму генпракурору СССР — В.Т.), што яго трэба арыштаваць!» — «Ты мярзотнік! Як жа ты па начах спіш пасля гэтага!» — «А ты ў гэтую справу не лезь! Яна брудная!» — «А я абавязкова ўмяшаюся!»

І ўмяшаўся, падпісаў калектыўны ліст у абарону Бродскага. Але яму самому часта не хапала падтрымкі калег. Асабліва не хапала яе ў цяжкі момант разгрому часопіса. Твардоўскі тады цяжка захварэў і памёр праз паўтара года — 18 снежня 1971.

Яму быў усяго 61 год.



# І па-ва-лі-ла!

«Сэкс у вялікім горадзе», «Сябры»/Friends, «Сайнфелд» — ото былі серыялы! Піша **Ліза Кавальчык**.

«Сэкс у вялікім горадзе — 2», які выйшаў цяпер на экраны, расчароўвае. Адзінае, што хаваецца за лядашчым сцэнаром, — спекуляцыі на былой славе і непрыхаваная рэклама турыстычных і гандлёвых брэндаў. Гераіні, чатыры бескампрамісныя ў пытаннях сэксу нью-ёркаўкі, згубілі сваю дзёрзкасць і выклік грамадству ды зрабіліся... як усе.

Але выхад сіквэлу — нагода прыгадваць шыкоўнае мінулае: серыялы канца 1990-х і пачатку 2000-х, што зрабілі рэвалюцыю на тэлебачанні і ў галовах людзей: «Сэкс у вялікім горадзе», «Сябры»/ Friends, «Сайнфелд».

У сярэдзіне 90-х рэйтынгі мыльных опер імкліва падалі. Людзям надакучыла бачыць сямейныя разборкі пазашлюбных дзяцей ад пятай жонкі і расстанні-сыходжанні Ідэн і Круза. У адказ на попыт амерыканская тэлекампанія NBC і кінакампанія «Браты Уорнэры» выпусцілі некалькі новых серыялаў. Іх героі, перасяленыя з шыкоўных вілаў у звычайныя кватэры, менш за ўсё думалі пра сямейныя повязі і больш — пра праблемы ўладкавання цяперашчыны, не забываючыся на занядбаную ў 80-х самаіронію. Чым серыялы канца 90-х і пачатку 2000-х адрозніваюцца ад мыльных опер 80-х?

### Каханне — нішто, сяброўства — усё

Каханкі ў Кэры, Саманты, Міранды, Шарлоты з'яўляюцца і сыходзяць, а нязмушаная гутарка «як гэта было» вакол століка ў нью-ёркскай кавярні застаецца. На першае месца ў серыялах 2000-х выходзіць сяброўства. Дарэчы, і самыя папулярныя серыялы апошняга года: «Д-р Хауз» і «Тэорыя вялікага выбуху» пайшлі па слядах менавіта прасякнутых духам таварыства папярэднікаў.

І, вядома, зацыкленасць на чатырох героях: і ў «Сайнфелдзе», і ў «Сэкс-горадку» прадукуюць менавіта гэтую колькасць галоўных дзейных асобаў, а дакладней, галоўных тыпажоў. У «СуВГ» гэта: мройная зануда, іранічная разумніца, гуллівая бязладніца і цікаўная дасціпніца. Не, пачакайце: у «Сябрах» галоўных герояў усё ж шэсць, але прынцып вы зразумелі — стаўка на абмежаваную колькасць яркіх асобаў, а не на неспадзяваныя выкрыцці і прызнанні.

### Тут і цяпер

Пасля дзесяці гадоў несупыннай «Санты-Барбары» ўсім стала раптам напляваць на радавод. Безумоўна, да гэтых зменаў у свядомасці гледачоў прыклаўся Біл Клінтан, які ў першым рэаліці-шоу сучаснасці, «Суд над прэзідэнтам», доўга муляўся, перш чым прызнаць інтымную сувязь з Монікай Лявінскі. А як толькі ён тое публічна зрабіў, усе адразу страцілі да яго і ягонага асабістага жыцця цікавасць: «Так, ён робіць гэта на працы, так, ён мае каханку, ну і што?!» Глеба для саладжавых сямейных драмаў, заснаваных на шкілетах у шафах і здрадах, была згубленая назаўжды.

### Нью-Ёрк, Нью-Ёрк

Перанос дзеяння з Заходняга ўзбярэжжа ЗША на Усходняе. З зацішна-заможных перадмесцяў Лос-Анжэлеса ў нью-ёркскі тлум. Цяпер героі жывуць у горадзе дзівакоў: безнадзейна аптымістычных актораў-пачаткоўцаў, непрызнаных геніяў. Тут усім пляваць, хто ты і як выглядаеш, а таксама з кім бавіш ночы — поўная свабода для персанажаў.

### Самаіронія як зброя супраць свету

Няма ні адмоўных, ні станоўчых герояў, ні злыдня Мэйсана, ні падступнай Джыны. Супакойцеся, ніхто нікога не хоча атруціць, каб прысабечыць магнацкія мільёны! Вось, да прыкладу, «Сябры»: паталагічны нешчаслівец Рос, мілы няўдаха-актор Джоўі, адвечная афіцыянтка з вялікім сэрцам Рэйчэл, нашто ім грошы — дайце ім спярша разабрацца са сваім жыццём!

Але, нягледзячы на пабытавы рэалізм новых серыялаў, рэалістычнага ў іх не далося. Гэта мы найперш пра «Сэкс у вялікім горадзе». «Кожны вечар мая гераіня выходзіць на спатканне і спіць з хлопцам, — кажа акторка Сінтыя Ніксан, якая грала ў серыяле ролю адвакаткі Міранды Гобс. — Вядома, што і я сама не такая і што я ўвогуле з цяжкасцю ўяўляю жанчыну з падобным ладам жыцця».

### Каму трэба Папялушка? Ды нікому

Цяжка дапусціць, што галоўную гераіню серыяла «Сайнфелд» Элейн Бенес — смяшлівую, дасціпную, але бязладную — чакаюць казачны прынц або такая ж кар'ера. Аўтары празрыста намякаюць, што зор яна з неба не ўхопіць. Таму ў серыялах націск на багатае падзеямі і смешачкамі жыццё-быццё. Пагатоў ад жартаў Элейн трасуцца сцены студыі і тэлескрыні. Людзі перасталі саромецца быць аднача-сова разумнымі і неўладкаванымі, і па-ва-лі-ла!

**П.С.** А фільм «Сэкс у вялікім горадзе-2» не глядзіце, лепей вазьміце падборку некалькіх сезонаў серыяла.

## «Ваўкі» вырваліся на экран

Грамадская прэм'ера «Ваўкоў» — 20 чэрвеня ў Брэсце, 21 — у Магілёве.

Першы паказ «Ваўкоў» адбудзецца пасля ўрачыстага адкрыцця VII Фестывалю беларускіх кінастужак у Брэсце.

«Ваўкі» — гэта псіхалагічная драма, дзея якой адбываецца ў пасляваенны час. Сюжэт: зімой з эшалона з асаблівымі зняволенымі збягае Кірыл Палятаеў. У роднай вёсцы не ўсе гатовыя прыняць уцекача — на яго ладзяць сапраўднае паляванне. Уцёкшы ў лес, выратаваны ад людзей-ваўкоў герой натыкаецца на зграю сапраўдных ваўкоў.

У фільме зняліся Андрэй Панін, Дзмітрый Ульянаў, Уладзімір Гасцюхін. Рэжысёр Аляксандр Колбышаў вядомы па ролі партызана Штыркіна ў фільме «Акупацыя. Містэрыі».

«Ваўкі» — антыталітарная трагедыя. Фільм пастаўлены паводле аднайменнай аповесці Аляксандра Чакмянёва, напісанай у 1963 г. За яе пісьменніка цягалі ў КДБ.

Прэм'ера адбудзецца ў Вялікай зале кінатэатра «Беларусь» (Савецкая, 62). Цана квіткоў: 5620, VIP — 6330, пуф і кілім — 8180. Кінасеансы пачынаюцца ў 17.30 і 20.30.

А 21 чэрвеня «Ваўкоў» пакажуць у Магілёве ў кінатэатры «Радзіма» (Ленінская, 47): сеансы а 13-й і а 17-й.

**АР**

## АНТ адмовілася здымаць «Вітаўта»

Замест мастацкай стужкі кіраўніцтва тэлеканала вырашыла абмежавацца двухсерыйным дакументальным фільмам. Сярод прычын — адсутнасць грошай на якасны фільм і ссоўванне тэрмінаў, да якіх карціна павінна была з'явіцца на экране.

«Вітаўта» планавалі зняць да прэзідэнцкіх выбараў. Гледачы павінны былі разгледзець у старажытным князі фігуру Аляксандра Лукашэнкі — моцную асобу, якая здолела «падняць краіну з каленаў» і гарантаваць яе незалежнасць. Але зняць якаснае кіно за паўгода (а столькі, у лепшым выпадку, засталося да старту прэзідэнцкай кампаніі) немагчыма.

**udf.by**




**16 чэрвеня ў 18.30 адбудзецца адкрыццё выставы пераможцаў конкурсу прэс-фатаграфіі ў Беларусі. Выстава будзе працаваць у аўтацэнтры Кіа Атлант-М (Баравая, 2) да 18 ліпеня. Уваход вольны. Сярод пераможцаў былі і фатографы «НН» Юлія Дарашкевіч і Андрэй Лянкевіч.**

Ад метро «Маскоўская» да прыпынку «Баравая» ідзе аўтобус 113, 113а. Ад пл. Якуба Коласа можна дабрацца маршруткамі, якія ідуць у кірунку Бараўлянаў.

## Сцісла

• **Аляксею Дудараву — 60.** Знакаміты драматург перайшоў чарговую жыццёвую мяжу 6 чэрвеня. Дудараў — аўтар п'есаў «Выбар», «Парог», «Вечар», «Радавыя», «Князь Вітаўт», «У прыцемках».

Ён нарадзіўся ў вёсцы Кляны, што пад Дуброўнам, на самым усходзе Беларусі. Паходзіць ён з адной з тых рэдкіх усходнебеларускіх сем'яў, у якіх у вайну выжылі і бацька, і маці. Праз бацьку-франтавіка і аднавяскоўцаў ён увабраў у сябе ваенны эпас, і вайна стала моцнай тэмай Дударава-драматурга.

Паводле ягонага сцэнара быў зняты папулярны фільм «Белыя Росы».

Дудараў кіруе Саюзам тэатральных дзеячаў, а ў свой час быў адным з заснавальнікаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі. У свеце мастацтва Дудараў з'яўляецца прынцыповым прыхільнікам беларусізацыі.

• **Фільм ураджэнца Баранавіч Сяргея Лазніцы знайшоў сваё шчасце.** Стужка «Шчасце маё» атрымала галоўны прыз прэстыжнага расійскага кінафестывалю «Кінатаўр». Гэта метафізічна-змрочны ігравы фільм пра кіроўцу, які збіўся з дарогі ў расійскай правінцыі і, сутыкаючыся з тутэйшымі, заглыбляецца ў сэрца зла. Фільм пастаўлены ва Украіне, на украінскія і нямецкія грошы. Лазніца нарадзіўся ў Баранавічах у 1964 г. Вучыўся ў Кіеве і Маскве, здымаў стужкі ў Расіі, з 2001 года жыве з сям'ёй у Нямеччыне, але асноўныя фільмы зняў у Санкт-Пецярбургу.

• **«Дзецідзяцей» разваліліся?** Папулярны гурт выправіўся ў бестэрміновы адпачынак. Музыкі кажуць, што «пачалі раздражняць адно аднаго». Заснаваны ў 2006 г., гурт «Дзецідзяцей» грае лёгкі рок. Сярод іншых груп «ДД» вылучаюцца далікатнасцю акустычнага гучання і вытанчанасцю тэкстаў. Нядаўна гурт выдаў беларускамоўны альбом «Рух», які з вялікім поспехам быў прэзентаваны на сцэне Купалаўскага тэатра.

• **«Машина времени» ў Міры задарма.** Гурт Андрэя Макарэвіча выступіць у межах «Музычных вечароў у Мірскім замку». Канцэрты пройдуць 18—20 чэрвеня ля муроў старажытнага замка. 19 чэрвеня сваю праграму з найлепшых твораў пакажа Тэатр оперы і балета. А айчынныя поп-выканаўцы правядуць «Песню года Беларусі». У апошні дзень «Музычных вечароў» выступіць Ігар Бутман з аркестрам. Апоўначы на сцэну выйдзе «Машина времени». Скончыцца свята феерверкам.

**КМ**

Найстаражытнешы дакумент Кіеўскай Русі знайшлі ў сінагозе. Піша **Алег Дзярновіч**.

# Частка VII. Хазары

**Працяг. Пачатак у № 26, 28, 30, 39, 47 за 2009 год, № 7 за 2010 год.**

## Каму ўладарыць на ўсходзе Еўропы: хазарам ці русі?

У апошні раз мы закранулі тэму прасоўвання ва Усходняй Еўропе варагаў-русі і тое, як яны палітычна і культурна сутыкнуліся з дамінацыяй у гэтым рэгіёне хазараў. Каб ісці далей, нам не ўхіліцца ад асобнай, няхай і незаслужана кароткай, гаворкі пра гэты загадкавы народ.

## Паходжанне хазараў

Першыя звесткі пра хазараў з’явіліся ва ўсходняй частцы Паўночнага Каўказа (цяперашні раўнінны Дагестан) хутка пасля нашэсця гунаў, якія ў 375 г. змялі гоцкую дзяржаву Германарыха.

Хазары сфармаваліся ў выніку ўзаемадзеяння трох этнічных кампанентаў: мясцовага арыйскага іранамоўнага насельніцтва, а таксама прышлых вугорскіх і цюркскіх плямён, захопленых у доўгую вандроўку ў выніку прасоўвання гунаў. Гісторыя фармавання гэтага народа — добры прыклад таго, якімі нечаканымі маглі быць у старажытнасці шляхі ўтварэння этнічных супольнасцяў.

Паўтара стагоддзя хазары займалі падпарадкаванае становішча ў качавых імперыях, якія змянялі адна адну, пакуль пасля распаду ў сярэдзіне VII ст. Цюркскага каганата не стварылі ўласную дзяржаву — Хазарскі каганат, які праіснаваў ад 650 да 969 г. і стаў адным з самых доўгатрывалых качавых аб’яднанняў ва Усходняй Еўропе I тысячагоддзя новай эры.

Займаючы спачатку ўсходнія тэрыторыі Дагестана, хазары пачалі рассяляцца ў Крыме, на Доне і асабліва ў Ніжнім Паволжы, куды, у новазбудаваны горад Іціль, была перанесеная сталіца дзяржавы. У 787 г. хазары задушылі паўстанне готаў у Горным Крыме ды захапілі яго завадатара, біскупа Яна. Хазары кантралявалі Крым і Керчанскі праліў аж да падзення сваёй дзяржавы. Як высвятляецца, даволі ўдалым было іх прасоўванне ў ніжнім і сярэднім (цяпер украінска-беларускім) Падняпроўі.

Наступствам хазарскай гегемоніі стала спыненне плыні качэўнікаў, што скіроўваліся з Азіі. Гэта мела пазітыўныя наступствы для народаў Цэнтральнай Еўропы.

## Дуалізм як унутраны лад

Спачатку Хазарыя была тыповым качавым ханствам, у якім палітычныя традыцыі і тытулатура былі пазычаныя ў Цюркскага каганата. На чале дзяржавы стаяў каган, які фармальна валодаў усёй паўнатой вайсковай і адміністратыўнай улады, але не меў апарату прымусу для выканання сваіх рашэнняў. Каган быў галавою паганскага культу і ў вачах падданых валодаў звышнатуральнымі здольнасцямі. Стаць каганам мог толькі прадстаўнік царскага роду, улада ў якім перадавалася паводле прынятай у цюркаў традыцыі — ад старэйшага брата да малодшага.

Але вера ў боскую сілу ўладара прыводзіла да таго, што кагана маглі абвінаваціць у няшчасцях дзяржавы ды скінуць з трона. Само жыццё кагана было строга рэгламентаванае. Арабскія аўтары аль-Істархі, Ібн Хаўкаль, аль-Масудзі і Ібн Фадлан падрабязна апісалі рытуалы ўзвядзення хазарскага кагана на трон — будучага афіцыйнага галаву дзяржавы душылі шаўковым матузком, і той у паўсвядомым стане павінен быў сам назваць колькасць гадоў свайго царавання. Калі гэтыя гады праходзілі, кагана забівалі. Калі ж ён называў празмерна вялікую колькасць гадоў, яго ўсё роўна забівалі па дасягненні ім саракагадовага ўзросту, бо лічылася, што з гадамі боская сіла пакідае кагана. Паганскі культ уладара ўрэшце ператварыў кагана ў бяздзейнае сакралізаванае паўбоства.

Усё ж у даюдзейскі перыяд дынастыя каганаў кантралявала войска, што дазваляла ёй пазбягаць сакральных абмежаванняў. Аднак пасля ўзвышэння іншага хазарскага клана, які спавядаў юдаізм, рэальная ўлада апынулася ў другой паводле іерархіі асобы — бека. Улада ў гэтай новай дынастыі, відавочна пад уплывам юдаізму, стала перадавацца ўжо строга ад бацькі да сына.

За каганам засталіся сакральныя функцыі, фармальна больш значныя. Зямнымі ж справамі Хазарыі распараджаўся бек, тытул якога часта перакладаюць як «цар». Пры гэтым бек рытуальна ўшаноўваў кагана, што мяжавала з прыніжэннем. Уваходзячы да кагана, бек станавіўся на калені ды трымаў у руках запаленую галінку.

Каган жыў ізалявана ў сваім палацы, выязджаючы раз на год на чале ўрачыстай працэсіі. Пры ўсёй фармальнасці ўлады, кагана шанавалі суседнія паганскія народы, ён меў непахісны аўтарытэт сярод звычайных хазараў. З культам кагана сутыкнуліся варажска-рускія конунгі і ярлы, якія замацаваліся ў басейнах Дняпра і Дзвіны. Русь пераняла тытулатуру валадара хазараў як самую вядомую і шанаваную ў рэгіёне. Замежныя партнёры таксама называлі правадыра русаў «каганам». Хоць праз фрагментарнасць тагачасных крыніц цяжка сцвярджаць, дзе знаходзіўся Каганат русаў — на Поўначы ці Поўдні будучай Кіеўскай Русі.

## Юдаізм як дзяржаўная рэлігія

Выключнае значэнне для далейшай гісторыі Хазарыі мела тое, што на тэрыторыі, якую кантралявалі хазары, існавала значная колькасць габрэйскіх грамад. Яны забяспечвалі функцыянаванне гандлю і фінансавай сістэмы каганата. Размяшчэнне хазараў на сутыку хрысціянскай і ісламскай цывілізацый, а таксама ўплыў на ўнутранае жыццё дзяржавы юдзеяў, прывяло да ўтварэння ўнікальнай канфесійнай сітуацыі — суіснавання ў Хазарыі трох монатэістычных рэлігій.

Прыкладна ў 740 г. адзін з хазарскіх вайсковых правадыроў Булан прыняў юдаізм. Гэты крок фінансава і арганізацыйна ўмацаваў пазіцыі ягонага клана, у той час як становішча кіроўнай паганскай дынастыі стала пагаршацца ў выніку скарачэння ваеннай здабычы і немагчымасці працягваць далейшую заваёўніцкую палітыку. У пачатку IX ст. нашчадак Булана Абадыя заняў пасаду бека ды сканцэнтраваў у сваіх руках рэальную ўладу. У Хазарыі ўсталявалася сістэма падвойнага кіравання. Адбывалася гэта адначасова з умацаваннем юдаізму поруч з афіцыйным паганскім культам кагана.

У масавай свядомасці чытачоў гістарычнай літаратуры пашырылася меркаванне, што каганат ёсць формай юдзейскай дзяржавы. Як паказвае бліжэйшае знаёмства з гісторыяй, сама форма і тэрміналогія каганата ёсць старажытнай цюркскай традыцыяй. А юдаізм стаў




**Карта: Усходняя Еўропа ў часы фармавання Русі (другая палова VIII — першая палова IX стст.) (Гістарычны атлас Беларусі. Т. 1. с. 44.)**

цывілізацыйным, урбаністычным уварваннем у напаўкачавы лад цюркаў.

Унікальнасць сітуацыі з прыняццем юдаізму ў тым, што гэтая монатэістычная рэлігія не заахвочвае празелітызму і не прадугледжвае навяртання ў сваю рэлігію неяўрэяў. Сучасныя даследчыкі сярод прычын хазарскага выбару называюць імкненне захаваць незалежнасць як ад хрысціянскай Візантыі, так і ад ісламскага Халіфата, а таксама звяртаюць увагу на сувязі юдзеяў з хазарскай знаццю.

Працэс юдаізацыі Хазарыі быў працяглым. Усталяванне артадаксальнага (равіністычнага) юдаізму звязана з дзейнасцю бека Абадзія, які пачаў актыўна будаваць сінагогі. У Хазарыю памкнуліся габрэі з суседніх краін. Калі ж у Візантыі ў першай палове IX ст. распачаліся ганенні на габрэяў, хазарскі бек у адказ пачаў пераследаваць хрысціян.

Часам заняпад каганата звязваюць з прыняццем юдаізму, хоць рэальны крызіс у каганаце пачаўся на стагоддзе пазней. Што ж тычыцца ступені пашырэння гэтай рэлігіі з Хазарыі, то погляды даследчыкаў вельмі розняцца. Скептыкі сцвярджаюць, што юдаізм рэальна пашырыўся толькі сярод часткі кіроўнага слоя. Археалагічныя раскопкі даюць мізэрныя сляды юдзейскага культу, зрэшты, як і хрысціянскага ці мусульманскага. Падобна, для глыбейшага пранікнення юдаізму бракавала часу.

Але ўсё ж у хазараў былі магчымасці і імкненні да пашырэння юдаізму і па-за межамі ўласнай дзяржавы.

## «Кіеўскі ліст» і праблема заснавання Кіева

У 1896 г. Саламон Шэхцер даставіў у бібліятэку Кембрыджскага ўніверсітэта велізарную калекцыю габрэйскіх манускрыптаў старажытнай сінагогі горада Фустат-Міер, сталіцы сярэднявечнага Егіпта. Яго руіны знаходзяцца на поўдзень ад Каіра. Даўні габрэйскі звычай забараняў знішчаць тэксты, якія ўтрымліваюць імя Бога альбо ўрыўкі з Пісання. Так рукапісы дайшлі да даследчыкаў.

У 1962 г. прафесар Чыкагскага ўніверсітэта Норман Голб звярнуў увагу на адзін з рукапісаў. Голб пісаў: «...На мяне зрабілі моцнае ўражанне як яўная старажытнасць фрагмента, так і пералік асабовых імёнаў унізе аркуша, да таго ж імёнаў не габрэйскага ці семіцкага паходжання». Амерыканскі гебраіст запрасіў да супрацоўніцтва ў вывучэнні помніка прафесара Гарвардскага ўніверсітэта Амялляна Прыцка, які ў 1991 г. стане першым дырэктарам Інстытута ўсходазнаўства НАН Украіны. Зварот Голба да Прыцка быў невыпадковым — у лісце, а гэта быў менавіта ліст-пасланне, ясна чыталася: Qiyyōb — гэта значыць Кіеў. Ліст датуецца X ст. і, такім чынам, ёсць найстаражытнейшым аўтэнтычным да-



**Хазарскія руны, якімі заканчваўся знакаміты «Кіеўскі ліст» X ст. Руны не дэшыфраваныя, але прынята лічыць, што хазары размаўлялі на цюркскай мове булгарскай групы. Таксама ўстаноўлена, што з сучасных моваў да хазарскай найбліжэй знаходзіцца чувашская.**

кументам, які выйшаў з тэрыторыі Кіеўскай Русі.

У Савецкім Саюзе гэты дакумент было прынята не афішаваць. Па-расійску дакумент быў апублікаваны ўпершыню толькі ў 1997 г.

Ліст утрымлівае просьбу да габрэяў іншых гарадоў ахвяраваць грошы дзеля выкупу Якава Бэн Ханукі, які трапіў у пазыкі праз рахункі свайго брата. Якаў скіраваўся па габрэйскіх грамадах збіраць грошы, а гэты ліст быў фактычна лістом-паручальніцтвам юдзейскай грамады Кіева. У канцы ліста стаялі подпісы адзінаццці гэтых паручальнікаў.

Ліст складзены на габрэйскай, але апошняе слова было прыпісана цюркскім рунічным пісьмом, як мяркуецца, на хазарскай мове. Ліст утрымлівае родавыя несеміцкія імёны прадстаўнікоў юдзейскай грамады Кіева, сярод якіх даволі выразна чытаюцца цюркскія «Кабар», «Савар» і славянскае «Гасцята». Гэты ліст дае падставы сцвярджаць, што ў X ст. у Кіеве існавала заўважная грамада хазараў-юдзеяў, якая падтрымлівала актыўныя кантакты з адзінаверцамі і магла высылаць сваіх прадстаўнікоў у Каір. І сёння ў Кіеве захавалася ўрочышча Казары, якое этымалагічна паходзіць ад саманазвы хазараў (у старажытнарускай мове іх так і звалі — «козары»).

Але А.Прыцак у сваіх развагах пайшоў далей — ён даводзіць, што Кіеў быў не проста заходнім фарпостам хазараў, але і быў заснаваны імі не раней за першую палову IX ст. на заходняй мяжы Хазарыі, якая праходзіла па Дняпры. Гэтая версія выглядае надта нечаканай, але і афіцыйная канцэпцыя яшчэ 1980-х, якую прапаведваў вядомы ўкраінскі археолаг Пётра Талочка, што Кіеў быў племянным цэнтрам палянаў яшчэ з V ст., гучыць зусім фантастычна.

Рускія летапісы паведамляюць, што племянныя саюзы Падняпроўя, найперш паляне, а таксама радзімічы летапіснага часу плацілі даніну хазарам. І варагі-русь, якія так шмат пазычылі ў вонкавых прыкметах дзяржаўнасці ад хазараў, у сваім прасоўванні па Дняпры ўрэшце мусілі ўступіць у канкурэнцыю з каганатам за дамінацыю ва Усходняй Еўропе.

**Працяг на старонцы 15.**



**Даніна палянаў хазарам. (Ілюстрацыя XV ст. з «Радзівілаўскага летапісу».) Паводле летапісаў, паляне плацілі даніну «ад дыма меч» — гэта значыць давалі меч ад кожнай хаты. На мініяцюры мы бачым, як паляне перадаюць хазарам меч. Севяране і вяцічы давалі хазарам «па вавёрцы і дзявіцы ад дыму». Радзімічы плацілі «па шэлегу», але ў 885 г. кіеўскі князь Алег загадаў ім: «Не дайце казарам, але мне давайце!»**

# Як ратавацца ад спёкі

**Пры тэмпературы вышэйшай за 26 градусаў кожныя паўгадзіны трэба выпіваць шклянку вады.**

Медыкі раяць простыя сродкі:
— піць зялёную гарбату,
— насіць лёгкую, светлую адзежу з натуральных тканін,
— хавацца ў цяні,
— есці марожанае,
— менш карыстацца касметыкай.

У спякоту не варта піць піва і моцную каву. Першае выклікае абязводжванне, а другая — нагрузку на сасуды.

Не раяць дактары піць моцныя алкагольныя напоі, нават у кактэйлях. У спалучэнні са спякотай гэта можа выклікаць спыненне сэрца.

Пры тэмпературы вышэйшай за 26 градусаў кожныя паўгадзіны трэба выпіваць шклянку вады. Астудзіць паветра ў памяшканнях дапамогуць і ёмістасці з вадой. Карысна ў спякотныя дні пырскаць у памяшканні пульверызатарам, класці на плечы мокрую хустку, прымаць халодны душ.

Пры пагаршэнні самаадчування варта раз на дзве гадзіны паляжаць на канапе — гэта дапаможа знізіць ціск у сасудах.

Гэтыя парады лёгка выканаць дома і на працы. А што рабіць тым, хто ў такую спёку павінен шмат часу праводзіць за стырном?

Панізіць тэмпературу ў машыне можна некалькімі спосабамі. Самы просты — выкарыстоўваць шторкі для абароны ад сонца. Таксама варта часцей мыць машыну. Чым больш бруду на кузаве і шкле, тым горш ад іх адлюстроўваецца сонечнае святло і тым хутчэй машына награецца.

**Алесь Пілецкі**

**Не загарайце празмерна!**

Празмерны загар сушыць скуру і паскарае працэс старэння. Бесперапыннае загаранне можа выклікаць рак. Сонечная радыяцыя разбурае калагенавыя валокны, што памяншае эластычнасць скуры. Ультрафіялетавыя промні пранікаюць глыбей — у дэрму — і выклікаюць некантраляваныя змены ў эпідэрмісе, аслабляюць імунныя механізмы скуры. З'яўляюцца новыя радзімкі. У канцы гэтага спіса — меланома і іншыя наватворы.

**Пара парадаў наконт кандыцыянера і вентылятара**

Самы просты выхад — купіць вентылятар. Калі пад яго пакласці некалькі бутэлек з вадой, папярэдне замарожаных у маразільніку, атрымаецца яшчэ і халоднае паветра. Набываючы вентылятар, звяртайце ўвагу на ўзровень шуму, абарону ад пападання вады ўнутр механізма.

Кандыцыянеры існуюць двух тыпаў: стацыянарныя кампрэсарныя і лёгкія мабільныя. Апошнія не патрабуюць папярэдняй устаноўкі.



# 8 памылак пры першым спатканні

**Размовы па мабільніку, паход у кіно, залішняя маўклівасць могуць вам нашкодзіць.**

Спатканні — цэлы свет са сваімі законамі і рытуаламі. Восем рэчаў, якіх не варта рабіць да/падчас/пасля першага спаткання.

### 1. Хлусіць на сайце знаёмстваў

Чалавека, які даведаецца, што вы схлусілі, апануе расчараванне. Кажы праўду. Мы лепшыя за нашы ілюзіі!

### 2. Ісці ў кіно

Першае спатканне прызначана для знаёмства двух людзей, а не для знаёмства з Сарай Джэсікай Паркер. Абодва бакі прыходзяць на першае спатканне, каб выйсці з яго хаця б з мінімальнымі ведамі пра другі бок, каб вызначыцца наконт працягу. Сядзенне перад экранам не вырашыць гэтай задачы.

### 3. Размаўляць па мабільніку

Акрамя кіраўнікоў дзяржавы і выратавальніка свету доктара Хаўза, усе астатнія людзі могуць дазволіць сабе час ад часу выключаць мабільнік. Маеце сур'ёзныя намеры — выключыце мабілу.

### 4. Не казаць пры канцы спаткання пра свае пачуцці

Няпісаныя законы спатканняў кажуць, што



фраза «Добранька, стэлефануемся» азначае, што ніхто званіць не будзе. Наша парада: калі вам, праўда, спадабалася спатканне, скажыце пра гэта. Гэта дазволіць другому боку пачувацца пэўней. Да таго ж, у такім выпадку імгненна адчуеце, ці вашыя пачуцці ўзаемныя.

### 5. Імкнуцца да фізічнай блізкасці і апранаць адкрытае адзенне

Калі вы марыце пра сур'ёзную сувязь, не спяшайцеся са зблiжэннем. Сачыце за другім чалавекам: словы, жэсты, позіркі скажуць вам, ці варта працягваць.

### 6. Пытанне аплаты рахункаў

Кожны мужчына павінны ўлічыць, што, нягледзячы на пашырэнне фемінізму ў нашых краях, большасць беларускіх жанчын па-ранейшаму чакае, што на іх спатканні разлічвацца будзе менавіта мужчына. З іншага боку, калі жанчына чакае, што мужчына будзе плаціць, не трэба прыходзіць на спатканне галоднай.

### 7. Запаўняць увесь час размовамі і не даваць другому боку адкрыць рот

Ёсць шмат людзей, якія ад усхваляванасці гавораць і гавораць. «Аднабаковыя» спатканні будуць павярхоўнымі, бо толькі адзін з дваіх прэзентуе сябе як след.

### П. С. 8. Ніколі не шкадуйце, што прыйшлі.

Ваша спатканне — цудоўная магчымасць сустрэць калі не вашу палавіну, дык проста цікавага чалавека, або паслухаць адрозныя ад вашых погляды на жыццё.

**Сямён Цыбульскі**

КАХАННЕ І СЭКС

## 10 запаветаў для закаханай/га

Закаханасць — рамантычны і мудры патэнт эвалюцыі, які развіўся толькі ў чалавечага роду. Мэта кахання — «прыляпіць душамі» людзей розных палоў адно да аднаго ў сямейнай адзінцы.

Закаханасць — узнёслае пачуццё, якому па інтэнсіўнасці няма прыкладаў ва ўсім спектры людскіх эмоцыяў. Закаханы чалавек часам нібы вар'яцее — рэўнасць, сум, пакуты, боязь за сваё каханне.



Але з часам каханне набывае сталасць, дзе, акрамя закаханасці, захавана месца для праўдзівага сяброўства, узаемнага даверу, падтрымкі і салідарнасці. Жарсці сцішаюцца, і гэта не страшна. Закаханасць — смак жыцця, а любоў — гэта само жыццё.

Перад вамі 10 запаветаў закаханага. Адны з іх важныя для жанчыны, другія – для мужчыны.

1. Не будзь занадта даступнай.
2. Не прызнавайся заўчасна ў каханні.
3. Не расказвай усіх сваіх таямніц.
4. Не «раствbooрайся» цалкам у прадмеце сваёй закаханасці.
5. Не выпытвай і не прымушай распавядаць усе яго/яе таямніцы.
6. Будзь шчодрым, велікадушным, уцешным.
7. Вучыся выказваць свае пачуцці і эмоцыі.
8. Будзь сабой.
9. Калі заляцаешся, дык разумна. Не забывайся пра асабістую прастору другога боку.
10. Думай, увесь час думай пра тое, як прынесці радасць сваёй другой палавіне.

**Сямён Цыбульскі**

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## У цэнтры Цюрыха гадзіну лавілі слана

У Цюрыху (Швейцарыя) каля гадзіны лавілі сланіху, якая збегла з цырка, што прыехаў на гастролі.

Сланіха па мянушцы Сабу ў нядзелю днём вырвалася на волю, калі яе пераводзілі ў трэйлер. Жывёла прагулялася па дзелавым цэнтры Цюрыха і нават паспела паплаваць у возеры.

Толькі праз гадзіну дрэсіроўшчык здолеў пераканаць Сабу вярнуцца ў цырк.

Сабу падчас шпацыру нічога не пашкодзіла.

## На латвійскіх грошах з'явілася рапуха

Банк Латвіі выпусціў у абарот новы лат, на рэверсе якога намаляваная рапуха. Грошы адчаканены на манетным двары ў Германіі. У Латвіі заўсёды шанавалі рапух. Лічылася, што ропа нясе ў дом шчасце. Раней іх нават паілі малаком.




**ЯВ; БЕЛТА**

АЎТО

## Chrysler адклікае 35 тысяч аўтамабіляў

**У іх заліпала педаль газу.**



У асноўным гэта мадэль Dodge Caliber 2007 г. выпуску і пазадарожнік Jeep Compass.

Раней з такой праблемай сутыкнулася Toyota, якая карыстаецца паслугамі таго ж вытворцы запчастак, што і Chrysler, кампаніі CTS. Японскаму канцэрну ў сувязі з аналагічнай праблемай прыйшлося вярнуць на рамонт 8 мільёнаў аўтамабіляў.

**ЯВ**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

## У Гватэмале ўтварылася дзірка ў зямлі

У сталіцы Гватэмалы, Гватэмала Сіці, з'явілася агромністая дзірка, глыбіню якой нават складана высвятліць.

Геолагі мяркуюць, што такая рэдкая прыродная з'ява выкліканая працяглымі дажджамі і ссоўваннем вялікіх пластоў пароды.

Цікава, што гэта не першая такая з'ява ў гэтай краіне. Тры гады таму сталіца Гватэмалы ўжо бачыла вялікую дзірку.

**АП**



ЗАБАБОНЫ

## Нумар смерці ўрэшце адключылі

...пасля таго, як кожны з трох уласнікаў зайздроснага нумара 0-888-888-888 балгарскага аператара сканаў пры загадкавых абставінах. Першым дзесяць гадоў таму нумар узяў сабе выканаўчы дырэктар балгарскага мабільнага аператара «Мабітэль». А ў 2001-м, усяго ў 48 гадоў, памёр ад раку.

Потым нумар перайшоў да галоўнага балгарскага мафіёзі Канстанціна Дзімітрава. У 2003-м яго застрэляць па дарозе ў Нідэрланды. У кішэні 31-гадовага нябожчыка ляжаў мабільнік.

Наступны ўладальнік нуля з дзевяццю васьмёркамі — гандляр нерухомасцю Канстанцін Дышлеў. Яго таксама забілі. Тады мабільная кампанія вырашыла адключыць нумар 0-888-888-888 зусім.

**Cz**




# Лета-2010: Сем самых цікавых фэстаў на вольным паветры

## Be2gether

**25—27 чэрвеня.** Музычны фэст на літоўска-беларускім памежжы Be2gether. Ля вёскі Нарвілішкі можна будзе пачуць сусветна вядомыя гурты — **Skunk Anansie**, **Empire Of The Sun** (Аўстралія), **Roots Manuva**, **«Гайдамаки»** (Украіна), **Casiokids** (Нарвегія), **Bauchklang** (Аўстрыя), **«Рубль» са Шнуравым** (Расія). З усіх трох Be2gether'аў сёлетні — самы беларускі. Беларусь на фестывалі прадстаўляць ажно 4 гурты: **CherryVata**, **Open Space**, **Akute** і, вядома, **Лявон Вольскі** з праектам на словы класічных паэтаў «Белая яблыня грому». А таксама беларускія павільёны, дзе можна будзе набыць кнігі і атрыбутыку. А таксама паэтычныя выступы-перформансы беларускіх літаратараў. Слоган Be2gether «Музыка адчыняе межы» ўжо шмат хто чытае як «музыка дае візу ў Еўропу», бо ўладальнікам квітка выдаецца дармавая літоўская віза на 5 дзён. Але арганізатары папярэджваюць, што памежнікі будуць старанна правяраць наяўнасць зваротнага квітка — так што пасля мяжы ні на якія моры не збочваем і праступем у Нарвілішкі. Падаць дакументы на візу можна да 17 чэрвеня. Цана квіткоў — 250 тыс. рублёў, але калі знойдзеце трох сяброў, то 185 тысяч.

## Навагрaдскі замак — 2010

**25—27 чэрвеня.** У тыя самыя дні на тэрыторыі летапіснай Літвы, але ўжо на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, адбудзецца Пяты фэст сярэднявечнай культуры «Навагрaдскі замак — 2010». Сёлета фэст прысвечаны 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. У праграме: тэатралізаваныя шэсці на чале з Вітаўтам і Ягайлам у атачэнні світы і прадстаўнікоў рыцарскіх клубаў. Конны і рыцарскі турнір ля падножжа Замкавай гары: лучнікі, вершнікі, мечнікі. І, вядома, фэст сярэднявечнай музыкі. На дэсерт — традыцыйны штурм крыжакамі Навагрaдскага замка. Большая частка мерапрыемстваў — бясплатная.

## Global Gathering Freedom Music

**26 чэрвеня.** Фэст электроннай музыкі Global Gathering Freedom Music. Зноў жа ў тыя самыя дні — легендарны як для Беларусі фестываль адбудзецца на аэрадроме «Баравая», ля мінскай кальцавой. На вольным паветры можна будзе патанчыць пад сусветную суперзорку **ды-джэя David Guetta**, а таксама **ды-джэя John Digweed'a** і непаўторнага **John'a**. Арганізатарам падалося, што гэтых траіх замала: яны дадалі **Sander van Doorn'a**, **Music Paul Thomas'a** і **Eston'a**. Галоўнае, каб не пайшоў дождж.

## Басовішча-2010

**16—18 ліпеня.** У лясах Беласточчыны фестываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча-2010», магчыма, пройдзе без NRM, «Крамы» і «Нейра Дзюбеля», аднак тамака будуць **«Тройца»**, **«Гурзуф»** і **«Адыс Абеба»** ды шэраг іншых. Упершыню плануе ўзяць удзел **«Ляпіс Трубяцкой»**. Фэст дармавы (хіба трэба раскашэліцца на месца пад намёт). Тут галоўная задача — здабыць візу ў Польшчу.

## 600-годдзе Грунвальдскай бітвы

**15—18 ліпеня.** Святкаванні, прысвечаныя 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. Таксама Польшча, таксама задарма і таксама пасярод голага поля. Але якога! Ля Дуброўна (Грунвальда, Жальгірыса) адзначаць юбілей перамогі беларуска-літоўска-польскага войска над Тэўтонскім ордэнам. Тэатралізаваныя шоу з удзелам Ягайлы і магістра фон Юнгінгена з коннымі харугвамі, рыцарскім турнірам, фаер-шоу, канцэртамі сярэднявечнай і народнай музыкі і збудаваны горад рамеснікаў. І, вядома, 17 ліпеня а 14-й — грандыёзная інсцэнізацыя векапомнай сечы, якая, дарэчы, не абыдзецца без беларускіх харугваў пад «Пагоняй». Чакаецца прыбыццё каля 5 тысяч рыцараў (нагадаем, у сапраўднай бітве ўдзельнічала ўсяго ў 12 разоў больш).

## Sziget

**11—16 жніўня.** Фэст Sziget. На выспе пасярод Будапешта адбудзецца адзін з найвялікшых музычных фэстаў свету. Галоўную сцэну акупуюць музыкі з **Iron Maiden**, **Faithless**, **30 Seconds to Mars**, **Kasabian** і наш **«Ляпіс Трубяцкой»**. Патанчыць жа можна будзе на **Party Arena: Infected Mushroom**, **Gotan Project**, **DJ Shadow**, **Simian Mobile Disco**, **Calvin Harris and Breakestra feat.** Мы любім і цэнім гэты фэст за музыку, але не толькі: «Сігет» ганарыцца сваімі тэатральнымі сцэнамі. Сёлета будуць выступаць вандроўныя цыркі, кітайскае агнявое шоу і тэатр танца. Шэсць дзён наведнікаў чакае беганіна паміж сцэнамі, але яна вартая гэтых высілкаў. Кошты 130—200 еўра. Віза ў Венгрыю патрэбная.

## Be Free — 2010

**21—23 жніўня.** Фэст Be Free — 2010 у Чарнігаве. У канцы жніўня ў Чарнігаве пройдзе штогадовы музычны фэст. Сёлета ён будзе трохдзённым. Арганізатары ўлічылі леташні вопыт і такім чынам хочуць вырашыць праблему вяртання ў Беларусь удзельнікаў фэсту і яго гасцей. Свой удзел у фэсце ўжо пацвердзілі **IQ-48**, **«Крама»** і **Neuro Dubel**. Перамовы з іншымі гуртамі, беларускімі і не толькі, працягваюцца. Як і «Басовішча», фэст у Чарнігаве бясплатны.

**Лявон К**

## КАНЦЭРТЫ

### Элтан Джон

**26 чэрвеня ў «Мінск-Арэне» (пр. Пераможцаў, 111)** адбудзецца канцэрт ангельскага кампазітара і спевака, кавалера ордэна Брытанскай імперыі Элтана Джона. **Пачатак а 20-й.**

### Ноч музыкі

**23 чэрвеня ў Вялікай канцэртнай зале Беларускай філармоніі** пройдзе канцэрт «Ноч музыкі». Выступаюць: варшаўскі гурт **«Zespol polski»**, **Крысціна Фонг** (скрыпка, віяланчэль) і **Міхаэль Карнацкі** (кларнет) са Злучаных Штатаў Амерыкі, лаўрэаты міжнародных конкурсаў **Сяргей Мікулік**, **Юрый Бліноў**, **Кацярына Матох** і інш. Таксама ў праграме новая харэаграфічная праца танцоўшчыка Уладзіміра Васільева (Расія) на музыку Ф. Шапэна. **З 19.00 да 5.00.**

### Купальскае кола

**29 чэрвеня ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** адбудзецца штогадовы фэст «Купальскае кола». Выступаюць: **«Палац»**, **Testamentum Terrae**, **Unia**, **«Рокаш»**, **«Гуда»**, **«Ліцвіны»**, **Андрэй Плясанаў** (гурт P.L.A.N.) ды інш. **Пачатак а 18-й.** Квіткі: папярэдне — 20 000 (плюс кампакт-дыск у падарунак), 25 000 — месца за столікам; у дзень канцэрта 25 000 — 30 000. Даведкі: (029) 649-08-88.

## ІМПРЭЗЫ

### Прысяга беларусаў

**18 чэрвеня ў сядзібе ТБМ (вул. Румянцава, 13)** адбудзецца выстава твораў і прэзентацыя кніг мастака Юрыя Малаша «Прысяга беларусаў», «Здабытак», «Рухайся наперад, беларусе», «Покліч Рагнеды». **Пачатак а 17-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Музей сучаснай беларускай моды

**У Нацыянальным гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** праходзіць выстава «Пачатак. Музей сучаснай беларускай моды». Гэта сумесны праект беларускіх дызайнераў і супрацоўнікаў музея, які адлюстроўвае сучасныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай моды. **Працуе да 29 жніўня.**

### Беларусь XVI—XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы

Выстава «Беларусь XVI—XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы» працуе **ў Нацыянальным гістарычным музеі РБ (вул.Маркса, 12)** да канца года.

### Выстава халоднай зброі

**У Галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці (вул. Гікалы, 4)** да жніўня працуе выстава халоднай зброі.

## ТЭАТРЫ

### 16 чэрвеня

**Тэатр юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр оперы і балета** — «Шапеніяна. Пахіта. Балеро»

### 17 чэрвеня

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»

### 18 чэрвеня

**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Тэатр оперы і балета** — «Шчаўкунок»

### 19 чэрвеня

**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»

### 20 чэрвеня

**Тэатр лялек** — «Вясёлы цырк»

### 21 чэрвеня

**Тэатр-студыя кінаактора** — «Майстар і Маргарыта»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

### 22 чэрвеня

**Тэатр оперы і балета** — «Эсмеральда»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»

### 23 чэрвеня

**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»

## КІНО

# Радасці старэчага сэксу

**Сэкс у вялікім горадзе-2** (Sex and the City 2)

ЗША, 2010, каляровы, 146 хв.

Рэжысёр: Майкл Патрык Кінг

**Ролі выконваюць:** Сара Джэсіка Паркер, Крысцін Дэвіс, Сінція Ніксан, Кім Кэтрал, Крыс Нот




**Жанр:** Набор жаночых фетышаў
**Адзнака:** 2 (з 10)

Чатыры смелыя сяброўкі з вялікага горада адпраўляюцца ў Арабскія Эміраты падрываць тамтэйшую мараль…

Яны зноў тут. Языкастая Кэры, якая высмейвае ўласны шлюб. Міранда, якая змагаецца за жаночую працу. Наіўненькая Шарлота ахвярна сплаўляе дзяцей грудастай няньцы. Нарэшце, бландзіністая Саманта — яна не баіцца ні Бога, ні чорта, ні, самае галоўнае, — цяжарнасці. Яны прыйшлі паказаць нам ліберальныя радасці модных жанчынаў.

Не хачу паказацца няветлівым — але гэта радасці старэчага сэксу.

І праблема не ў тым, што стужка — другасная частка благой копіі тэлесерыяла. І нават не ў тым, што змагаркі сэксуальнае рэвалюцыі дасягнулі 50-годдзя. Проста культ самазацятага геданізму — гэта заўжды старасць. Старасць Рыма, які абваліўся пад націскам варвараў; старасць ракакошнай французскай арыстакратыі, абезгалоўленай гільяцінай.

Фінальныя блясткі сучаснай раскошы: гламурнае вяселле салодкіх геяў (з вычапленай для гэтага шчасця сапраўднай Лайзай Мінэлі); пазалочаныя апартаменцікі са слугамі; стракатыя фарбачкі ўсходняга кірмашу; пантофлікі, сукеначкі, хустачкі, валізачкі, кактэйлікі і — рэвалюцыйны крок — кандомчыкі ў жаночым пашпарце.

На вялікім экране — бліскучая пустата. Яны крычаць і пляткараць. Яны змагаюцца з патрыярхатам. Яны цешаць сябе надзеяй, што паняволеныя жанчыны пад паранджой употайкі носяць веснавую калекцыю-2010 (спадзявайцеся надалей).

Але ва ўласнай кватэры яны ўжо толькі служанкі стомленае вінтажнасці.

Бяздзетная Кэры злякана прызнаецца, што варта прытрымлівацца традыцыі, хаця й стасаваць яе пад сябе.

Ці не спазнілася, панначка?

**Андрэй Расінскі**

# Чый роўмінг самы танны?

**«Наша Ніва» падлічыла, паслугамі якога з аператараў зручней за ўсё карыстацца, выязджаючы ў падарожжа.**

Выпраўляючыся ў доўгачаканы замежны адпачынак, людзі не хочуць заставацца па-за зонай доступу. Яны гатовыя плаціць вялікія грошы, каб нават на пляжы Адрыятычнага мора да іх маглі датэлефанавацца дырэктар кампаніі і любімая цешча. Роўмінг прапануюць усе тры GSM-аператары — МТС, Velcome і Life:). Кожны з іх мае істотныя асаблівасці.

МТС вызначаецца лёгкасцю падлікаў тарыфаў. Уся Еўропа разбітая на тры зоны: «Еўропа-1», «Еўропа-2» і краіны СНД. У кожнай — свае тарыфы ў далярах. Зручна вылічваць, але дорага плаціць.

МТС прапаноўвае самыя дарагія паслугі ў роўмінгу.

Ільготныя размовы распаўсюджваюцца толькі на Расію і Украіну.

Life:) пакуль што працуе толькі ў 16 еўрапейскіх краінах, але мае звышвыгадны льготны тарыф у шасці краінах: Расіі, Украіне, Турцыі, Польшчы, Балгарыі і Румыніі.

Толькі варта ўлічваць, што за кожны дзень, калі за мяжой выкарыстоўваліся галасавыя паслугі, з рахунку дадаткова здымаюцца 999 рублёў.

Тарыфы, якія прапануюцца кампаніяй Velcom, складана пераўтварыць у сістэму, лёгкую для запамінання. Адзіная нязменная лічба — 1770 рублёў за ўваходзячы званок. Усе астатнія хаатычна змяняюцца. Пры гэтым Velcom застаецца самым выгадным у Заходняй, Паўночнай і Паўднёвай Еўропе.

Часцей за ўсё айчынныя турысты карыстаюцца трыма паслугамі: тэлефануюць у Беларусь, пішуць смс-кі ў Беларусь і прымаюць званкі з радзімы. Нагадаем, што ўваходныя смс-кі застаюцца бясплатнымі нават у роўмінгу.

У якой менавіта замежнай сетцы трэба зарэгістравацца, каб атрымаць недарагую сувязь, варта ўдакладніць на сайтах аператараў.



На карце пазначаныя «сферы ўплыву» кожнага з аператараў. Чорным колерам пазначаныя краіны, дзе танней за ўсё карыстацца паслугамі МТС, шэрым — Velcom, светлым — Life:).

**Яўген Васількоў**

# Міжнародныя СІМ-карты — замена роўмінгу

**Для тых, хто часта выязджае за мяжу: плюсы і мінусы турыстычнай СІМ-карткі. Goodline (ці GlobalSim, ці Simtravel).**

Яна яшчэ не надта вядомая ў шырокіх колах, але ўжо набірае папулярнасць. Гэта міжнародная картка, якая працуе ва ўсіх краінах свету. Нумар зарэгістраваны ў эстонскім дыяпазоне +372 XXX XXX XX.

### Плюсы

**1.** Бясплатныя ўваходныя званкі. Не трэба пралічваць, як прымусіць суразмоўцу ўкласціся ў хвіліну. Хоча пагаварыць — хай плаціць сам. Прапанова дзейнічае ў 63 краінах свету.

**2.** Бясплатныя ўваходныя sms.

**3.** Параўнальна танныя званкі ў Беларусь. Хвіліна сувязі з Францыі каштуе 4100 рублёў плюс падаткі. А вось на Сімтрэвел — 1770 рублёў.

**4.** Адна сім-картка на ўсе краіны. Не трэба вазіць з сабой стосік картак.

**5.** Лёгка купіць. Пункты продажу раскіданыя па ўсёй Беларусі — у спісе каля 30 гарадоў. У адным Мінску картка прадаецца больш чым у 30 крамах «Сувязнога».

**6.** Грошы «не згараюць». Нават праз год можна дастаць картку з паліцы, і сувязь запрацуе.

### Мінусы

**1.** Аплата званка на GlobalSim перакладаецца на таго, хто тэлефануе. Пазваніць сваяку на турыстычную картку з мабільнага нумара МТС, Velcome ці Life:) будзе каштаваць 1100–2200 у залежнасці ад тарыфнага плана. Танней за ўсё званіць са стацыянарнага тэлефона. За хвіліну размовы «Белтэлекам» возьме 540 ці 750 рублёў у залежнасці ад часу сутак.

**2.** Вялікі першы ўнёсак. Картка з $1 на рахунку каштуе каля $25. Наступныя карткі экспрэс-аплаты можна будзе купляць за $10, $20, $50 ці $100. Той, хто хоча проста аднойчы бомкнуць дамоў, каб сказаць, што ён жывы-здаровы, згубіць многа грошай.

**3.** Новы нумар. Прыйдзецца прадыктаваць усім тым, ад каго варта чакаць званка, нумар у фармаце +372 XXX XXX XX. Калі ж званіць з гэтага нумара самому, не абысціся без паўхвіліннага расповеду, з якога нумара тэлефануеш.

**ЯВ**

# Дзе беларусу адпачыць без візы



Краіны СНД: Азербайджан, Украіна, Расія, Арменія, Казахстан, Кіргізія, Таджыкістан, Узбекістан, Малдова. Віза не патрэбная і для ўезду ў Грузію.

На Балканскім паўвостраве беларусаў без візы гатова сустрэць Сербія (да 30 дзён). У Чарнагорыю і Македонію, акрамя нацыянальнага пашпарта, трэба мець турыстычны ваўчар альбо запрашэнне.

Да 30 дзён без візы можна знаходзіцца на Кубе. Для Венесуэлы гэты тэрмін складае 90 дзён, але без права займацца камерцыйнай і аплачваемай дзейнасцю. Да 90 дзён можна адпачываць у Перу і Эквадоры. Бязвізавае наведванне Кітая дазваляецца толькі ў складзе турыстычнай групы.

Летась Гандурас і Нікарагуа ў аднабаковым парадку адмянілі візавы рэжым для грамадзян Беларусі. Тое самае і з Малайзіяй. Але трэба мець квіткі на зваротную дарогу, пацвердзіць плацежаздольнасць на час паездкі.

Беларусы пры наяўнасці нацыянальнага пашпарта і запрашэння ці турыстычных дакументаў могуць пабываць таксама ў Манголіі.

**Кастусь Матушыч**

# Гісторыя Беларусі. Частка VII. Хазары

Працяг са старонкі 12.

### Канец Хазарыі

Паводле звестак усходніх крыніц, Кіеў лічыўся рускім горадам ужо ў IX ст. «Аповесць мінулых часоў» датуе захоп Кіева русамі 882 г. Датаванне знаходзіць пацверджанне ў дадзеных нумізматыкі. Паводле летапісу, князь Алег (варажскае — Хельгі) прысвоіў сабе даніну падняпроўскіх плямёнаў, якую збіралі хазары. Як паказаў амерыканскі нумізмат Т. Нунэн, менавіта ў апошняй чвэрці IX ст. спыняецца плынь усходняга срэбра, якое паступала на Русь праз Хазарыю, — Хазарыя ўсталявала гандлёвую блакаду Русі. Паступленне срэбра ўзнавілася толькі ў 10-я гады X ст., але ўжо праз Волжскую Булгарыю, у абыход Хазарыі. Што цікава, радзімічаў, сярод іншых плямёнаў, князь Алег змусіў адмовіцца ад даніны хазарам досыць позна — гэта адбылося ў 885 г., у той час як паляне перасталі быць даннікамі хазараў у 864 г., а севяране — у 884 г.

Нейкі час хазарам яшчэ ўдавалася пераскіроўваць пагрозу з боку варагаў, якія і на Поўдні выкарыстоўвалі ўлюбёную тактыку марскіх нападаў. У 912—913 гг. за долю здабычы хазары прапусцілі флот русаў, у шэрагах якіх былі ўжо і славяне, у Каспійскае мора. Але калі парадзелая вайсковая экспедыцыя вярталася, хазары напалі і перабілі яе ўдзельнікаў. Затое ў 930-я правадыр русаў Хельгі (іншы, не Алег Вешчы), падбухтораны Візантыяй, напаў на хазарскую заставу на Таманскай паўвыспе.

Хазарыя мела складаныя адносіны з Візантыяй, але вырашальную ролю ў падзенні каганата адыгралі няўдзячныя вучні і пераймальнікі — Руская дзяржава. У 964 г. князь Святаслаў пазбавіў залежнасці ад хазараў апошняе племяннае аб'яднанне — вяцічаў, а ў наступным 965 г. разбіў хазарскае войска на чале з каганам і захапіў Саркел. У наступныя гады русь разграміла сталіцу каганата Іціль. Гэты момант лічыцца канцом існавання незалежнай Хазарскай дзяржавы.

Пасля падзення каганата ў паўднёварускія стэпы адразу хлынулі качэўнікі — полаўцы, якія будуць пастаяннай пагрозай для Кіева. Але для нашай гісторыі роля хазараў на гэтым не спынілася. Існуюць звесткі пра міграцыю хазараў у краіны Цэнтральнай Еўропы, дзе яны ўліліся ў склад габрэяў-ашкеназі. А менавіта гэтая супольнасць стала асновай габрэйства Вялікага Княства Літоўскага XV—XVIII стст. Апроч таго, нашчадкамі хазараў лічаць сябе сучасныя крымскія і троцкія караімы.

## Сапраўдная беларуская кухня

### Морква з гарохам

**4—5 морквінаў, 800 г свежага гароху ў стручках, 3—4 кавалачкі цукру, соль, кроп, 1—1,5 лыжкі масла, 0,5 лыжкі мукі, некалькі лыжак булёну.**

Каб прыгатаваць гэтую страву з двух гатункаў гародніны, трэба спачатку моркву патушыць асобна, а гарох адварыць у падсоленай вадзе асобна да паўгатоўнасці. Затым моркву і адцэджаны гарох трэба змяшаць, дадаць масла, соль, муку, кроп, даліць булёну і патушыць да гатоўнасці. У посныя дні замест булёну можна выкарыстаць ваду, а масла тады пакласці трохі больш.

**З кнігі В. Завадскай «Літоўская кухарка», 1854 г.**

**Падрыхтавала НБ**


## Прыватныя абвесткі

**ПАДАРОЖЖЫ**

**Таварыства аховы помнікаў запрашае** ў падарожжа «Па азёрным краі» 20 чэрвеня. Тэл.: (029) 111–73–32; (017) 262–73–43.

**Запрашаем** у падарожжа з 12 па 21 ліпеня 2010 г. па маршруце Чанстахова—Вена—Рым — Ватыкан—Фларэнцыя—Браціслава. Тэл.: (029) 618–72–99; (029) 518–72–27.

**ПРАЦА**

**Пячнік-пенсіянер дапаможа** вам змайстраваць ці адрамантаваць любую печку альбо камін. Тэл.: (029) 609–53–61.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


## Жарцікі



**Колькі грушак увойдзе ў пяцілітровае вядро?**
Ніводная, бо грушкі не маюць ног.

**Чаму купляюць шапку?**
Таму што задарма не даюць.

**Ці можа чалавек быць у пакоі без галавы?**
Можа, калі высуне галаву ў акно.

**Сабрала Валянціна Карнялюк**




Спёка — нагода скінуць вагу!







14 чэрвеня распачалося Цэнтралізаванае тэставанне. 67 тысяч абітурыентаў здавалі ў гэты дзень беларускую мову.

PHOTO.BYMEDIA.NET

У паказальных спаборніцтвах падчас выставы «Чалавек і бяспека» ўзялі ўдзел курсанткі Акадэміі МУС. ...і круцілі спецназаўцамі, як хацелі.




Нават бальшавікі за свабодны інтэрнэт. У санкцыянаваным мітынгу за адмену ўказа № 60 на плошчы Бангалор у Мінску ўзяло ўдзел сорак чалавек.




Навошта ездзіць у Пізу? «Мінскія вежы» нічым не горшыя. Жарт фатографа.

## Анекдоты

Самая моцная з афрыканскіх зборных — зборная Францыі!

* * *

Навукоўцы з НАН вывелі новую пароду сабакі — бульбдог.

* * *

Размаўляюць два сабакаводы.

— Я хацеў свайго сенбернара так выдрэсіраваць, каб ён гаўкаў, калі захоча есці. Сотні разоў я паказваў яму, як гэта трэба рабіць!

— Ну, і як поспехі? Гаўкае цяпер, калі галодны?

— Не, але ён цяпер нічога не есць, пакуль я не загаўкаю ...

* * *

— У вас ёсць пластыкавыя вуды на сем каленаў?

— Не. Толькі на шэсць. Не паспяваюць вырасці. Раскупляюць.

* * *

Мужчына прыходзіць у госці да свайго старога сябра і раптам бачыць, як па пакоі прабягае маленькая дзяўчынка.

— Дыплома! — кліча дзіця гаспадар хаты. — Прынясі нам кавы.

— Дыплома? Якое дзіўнае імя, — здзіўляецца госць. — Чаму яе так назвалі?

— Я адправіў сваю дачку вучыцца ва ўніверсітэт, а яна вось з кім адтуль вярнулася.

* * *

Заўтра адключаюць гарачую ваду. Сёння трэба намыць пабольш посуду.

* * *

Па вопратцы дачнікаў можна вызначыць, што было ў модзе дзесяць гадоў таму.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Нешчаслівы выпадак здарыўся з машыністам самахода,** які возіць пасажыраў між Беластокам і Ломжай. Машыніст Герман Малінка, наліваючы ў рэзервуар бензін, пырснуў міма. Бензін загарэўся і апаліў яму твар, грудзі і рукі.

**«НН». №22. 1910.**

**Васіль Быкаў, які прыехаў у Нямеччыну** на запрашэнне тамтэйшага ПЭН-цэнтра, цяпер пазбаўлены магчымасці з Нямеччыны выязджаць. Нямецкія ўлады падоўжылі яму візу на перабыванне ў краіне на паўгода толькі як аднаразовую. Цяпер ён не мае магчымасці выехаць з Нямеччыны, бо не змог бы вярнуцца назад.

**«НН». № 23. 2000.**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**

З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6340.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.06.2010.

Замова № 2894.

Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.

Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12